**№ 24 (334)** 27 чэрвеня 2003 **www.nn.by**

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

# Большы за Коласа



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Ён быў з тых, хто мог перайначыць ходу беларускай гісторыі.

Калі б ён стаў у 70-я гады дысыдэнтам, як Гавэл і Жэлеў, ён вырас бы ў палітычнага лідэра Беларусі.

Калі б ён дазволіў тады сабе поўную літаратурную свабоду і адмовіўся ад самацэнзуры, Нобэлеўскі камітэт ушанаваў бы яго нароўні з Салжаніцыным і Мілашам. Пасьля, калі наступіла жаданая палітычная свабода, было позна: выпетраліся ўспаміны, пад старасьць стала менш інтэнсіўным духоўнае жыцьцё, а галоўнае, скончыліся крайнасьці таталітарызму, у жорсткім сутыкненьні зь якім толькі і мог да канца аграніцца ягоны талент. У Быкава не было дару прадбачаньня. Ён ня быў прарокам ні ў творах, ні ў палітычных прагнозах.

Ён мог бы стаць дзяржаўным лідэрам на пераломе, як вугорскі мараліст Арпад Генц; зноў беларуская гісторыя мела шанец пацячы па больш літасьцівым рэчышчы. Хоць, ня выключана, у постсавецкім сечышчы ня зь ім аказалася б фартуна, і гісторыя кінула б яго пад абцасы паразы, як некаторых ягоных сяброў-палітыкаў.

Урэшце, ён мог бы стаць вызвалiцелем пасьля сьмерці — як Акіна, Сукарна ці Бандаранаіке, — але ў яго няма ні дачок, ні маладой жонкі, якія б прыйшлі ў палітыку пасьля ягонага спачыну. Адны сыны...

Ён не зьмяніў ходы беларускай палітыкі.

Выбух ягонай сьмерці раскідаў пісьменьнікаў па кутках неабсяжнага кабінэту старшыні Саюзу. Трэба пранесьці труну да могілак на руках, сказалі з кутка. Гэта ж так доўга, запярэчыў выдавец. Дастаеўскага праз увесь Пецярбург студэнты несьлі, горка кінуў крытык. Ды ўлада не дазволіць, падвёў рысу паэт. А ўсё ж і Быкава пранесьлі праз увесь горад.

Быкаў, чалавек зь нехарактэрнай для беларускага пісьменьніка бездакорнай рэпутацыяй, трымаўся незалежна і за саветамі, і пры Лукашэнку, поглядаў сваіх не хаваў, рэжыму не падтрымліваў, гідзіўся ім — за хамства і мэркантыльнасьць. Апошняе, магчыма, было асабліва брыдка яму — які пасталеў сярод «саракапятак» і меў унікальнае пачуцьцё сьмерці, настолькі дасканалае, што нават адчуў той момант, пасьля якога ён ужо ня здолеў бы вярнуцца і памерці на сваёй зямлі. Што яму было важна.

Уладу найбольш клапаціла, каб людзі ня сталі гаварыць, што «і Быкава атруцілі». Адсюль навязлівыя інтэрвію з дактарамі Бараўлянаў на ўсіх тэлеканалах, адсюль гэтае: «Как сообщили в больнице, где находился писатель, ему оказывалась вся необходимая медицинская помощь, сообщает РИА «Новости». Ну і што б гэтую ўладу і гэты час лепей характарызавала, чым такая боязь.

Для расейцаў ён Василь Быков, для немцаў Wassil Bykau.Толькі для нашых «супэррускіх» ён не Васіль — Васілій. Такое адбываецца праз сапраўдную культурную інваліднасьць той часткі беларусаў, для

Працяг на старонцы 3.

## Спыненая будоўля ля Курапатаў

**Менскія ўлады за два дні ліквідавалі пляцоўку фірмы «Вігэўрабуд».** Будаўніцтва катэджнага пасёлку «Сонечны» ля Курапатаў забароненае паводле рашэньня кіраўніка Менскае вобласьці У.Дамашкевіча. З ахоўнай зоны мэмарыялу прыбралі таксама гаспадарчыя пабудовы і гароды праваслаўнага Спасавага падворку, застаецца толькі капліца. Землі будуць закансэрваваныя да зацьверджаньня ахоўнай зоны мэмарыялу.

## Цэнзура на FM-радыё

**Міністэрства інфармацыі загадала кіраўнікам FM-станцыяў штовечар даваць поўную раздрукоўку інфармацыйных выпускаў і плэйлістоў за дзень.** Тлумачыцца гэта тым, што зь ліпеня ў этэры мусіць быць 50% беларускай (ня блытаць зь беларускамоўнай) музыкі. Але найперш раздрукоўкі могуць стаць доказамі «парушэньня заканадаўства аб СМІ». Аналізаваць матэрыялы будзе галоўны спэцыяліст Галоўнага аналітычнага ўпраўленьня міністэрства.

**СМ**

# Ліцэй змагаецца

**З 19 чэрвеня пачаліся акцыі ў абарону ліцэю. Паколькі дазвол на правядзеньне пікетаў давалі толькі на традыцыйнай плошчы Бангалор, іх было вырашана ладзіць несанкцыяванa і штоgive разу ў іншых месцах.**



Да таго, што ліцэісты 19 чэрвеня выйдуць на Кастрычніцкую плошчу, міліцыя выявілася падрыхтаванай. Выход на вуліцу Кірава перакрылі міліцыянты і амапаўцы (кожны не ніжэйшы за капітана): баяліся, відаць, што ліцэісты з бацькамі пойдуць да Адміністрацыі прэзыдэнта. Тады яны спакойна выйшлі дварамі на праспэкт Скарыны, а праспэктам — на галоўны пляц сталіцы. Майкі з надпісамі «Я люблю Ліцэй», гістарычныя ды геаграфічныя мапы, газэты з артыкуламі пра ліцэй, падручнікі — вось і ўвесь «рыштунак» удзельнікаў акцыі. Да навучэнцаў адразу ж падцягнуліся амапаўцы, якімі кіраваў супрацоўнік міліцыі ў цывільным з прозьвішчам Мухтараў. Падаецца, што праўда, сп.Мухтараў не захацеў і хуценька сышоў пасьля таго, як журналісты яго апазналі. Зьмяніў яго супрацоўнік гарадзкога ўпраўленьня міліцыі інспэктар Лагодзіч, які да таго спрабаваў ня выпусьціць навучэнцаў ліцэю на вуліцу Кірава.

Працяг на старонцы 2.

**«Наша Ніва» запрашае ўсіх ахвотных прадаваць газэту на вуліцах** Менску і ў электрычках. Зьвяртацца на тэлефон 284-73-29; e-mail: nn@promedia.by

**«Наша Ніва» запрашае на працу** фотарэдактара/макетавальніка — чалавека беларускага і настроенага на доўгатэрміновую супрацу. Зьвесткі пра сябе падаваць на электронны адрас nn@promedia.by

## Наша Ніва 1911

**Выйшла факсымільнае выданьне «Наша Ніва: Першая беларуская газэта з рысункамі. 1911 г.».** Цяпер «Наша Ніва» пачатку стагодзьдзя даступная ня толькі ў бібліятэчных падшыўках, але і ў факсыміле. Чытаецца як захапляльны раман выхаваньня. Пытайцеся ў кнігарнях.



Працяг са старонкі 1.

Акцыя прайшла вельмі мірна: ліцэісты сьпявалі ліцэйскі гімн (на матыў слыннага «Gaudeamus»), міліцыянты хадзілі вакол і тлумачылі па рацыях свайму начальству, што ўдзельнікі трымаюць «карты Савецкага Саюзу». Паўгадзіннае стаяньне — і абаронцы ліцэю арганізавана сышлі.

Гэткая самай спакойнай выдалася акцыя 20 чэрвеня. Не зважаючы на залеву, ліцэісты выйшлі на праспэкт Скарыны каля Нацбанку.

Выдавала на тое, што ўлады хочуць «выпусьціць пару ў сьвісток»: спадзяюцца, што ігнараваным навучэнцам хутка надакучыць зьяўляцца на вуліцах. Аднак пачатак новага тыдня прынёс нечаканыя зьмены. На прэсавай канфэрэнцыі 23 чэрвеня выкладчыцкі калектыў ліцэю (штатныя супрацоўнікі і сумяшчальнікі) заявіў пра сваю гатоўнасьць сысьці. «Мінадукацыі праігнаравала пазыцыю ўсяго пэдкалектыву, навучэнцаў, бацькоў. Мы патрабуем, каб ліцэй надалей заставаўся ў будынку па вуліцы Кірава, 21 і ім кіравала прымальная для калектыву адміністрацыя. У сытуацыі, якая склалася на сёньняшні дзень, мы лічым немагчымым заставацца на сваіх пасадах і прымаем рашэньне аб звальненьні з працы ў выпадку, калі рашэньне Міністэрства адукацыі ня будзе перагледжанае», — гаворыцца ў іх звароце. Усе выкладчыкі напісалі на імя Ўладзімера Коласа заявы на звальненьне (вынятак склалі толькі тры чалавекі, якіх цяпер няма ў Менску). Цяпер толькі ад Мінадукацыі залежыць, застанецца ліцэй дзяржаўным ці не, заявіў У.Колас.

Адразу пасьля прэсавай канфэрэнцыі адбылася чарговая акцыя. Гэтым разам ліцэісты сталі насупраць унівэрсаму «Цэнтральны», чым выклікалі надзвычайную цікаўнасьць амапаўцаў: адтуль жа толькі квартал да будынку Адміністрацыі. Зрэшты, цікаўнасьць была досыць добразычлівай: ахоўнікі парадку нават адвялі ад шэрагу ліцэістаў п’янага мінака.

Аднак аўторак 24 чэрвеня прынёс найбольшыя зьмены ў нібыта «ўнармаваны» сцэнар акцыяў. Выхад навучэнцаў Ліцэю імя Якуба Коласа на плошчу Якуба Коласа ўстурбаваў міліцыю. На «месца здарэньня» прыбыў намесьнік начальніка Савецкага РУУС палкоўнік Яўген Гуранкоў, паводле загаду якога тры месяцы таму пацярпеў Антон Кішкурна («НН» №15 за 25 красавіка). Ліцэістаў і іхных бацькоў пачалі пхаць ад праезнай часткі, з боку міліцыянтаў чуліся мацюкі. Зьявіліся й першыя затрыманыя: былы намесьнік дырэктара ліцэю Лявон Баршчэўскі, навучэнец Беларускага калегіюму фатограф Арцём Лява і карэспандэнт «НН» Зьміцер Дзядзенка. У карэспандэнта «НН» міліцыянт, які не назваўся, забраў дыктафон з запісам міліцэйскіх загадаў на плошчы і паспрабаваў яго разламаць (на шчасьце, няўдала). «Высьвятленьне асобаў» затрыманых заняло пэўны час. Л.Баршчэўскі пераконваў міліцыянтаў, што ўсю ягоную біяграфію яны могуць лёгка знайсьці ў 2-м томе «Беларускай энцыкляпэдыі». Але высьветлілася, што гэтай кнігі ў Савецкім РУУС няма.

Праз паўгадзіны затрыманых пачалі адпускаць. Паколькі акцыя не падпадала пад юрыдычнае азначэньне пікету, пратаколы нават не складаліся. Адзіныя страты — сьцёртыя зь лічбавага фотаапарата А.Лявы здымкі ды перазапісаная журналісцкая касэта.

**Аркадзь Шанскі**

# Ліцэй змагаецца







**19 чэрвеня. Пікет ліцэістаў на Кастрычніцкай плошчы сталіцы.**

**Літаратары Сяргей Мінскевіч і Андрэй Хадановіч прыйшлі падтрымаць ліцэістаў.** ▼





**Супрацоўнікі спэцслужбаў у цывільным сочаць за пікетам.**



**Маладая сям’я: паэты Вера Бурлак і Віктар Жыбуль.**



**Карты нясе ліцэіст Глеб Лабадзенка.**



**Міліцыянты на нейкі час спынілі ліцэістаў, выкладчыкаў і бацькоў у двары ліцэю**



**19 чэрвеня. Пікет на Кастрычніцкай плошчы закончаны. Але акцыі ў абарону ліцэю працягваюцца.**

# Хаваў народ

**Тысячы людзей прайшлі з Народным пісьменьнікам Беларусі ягоны апошні шлях ад Дому літаратара да Ўсходніх могілак. Ён лёг у зямлю недалёка ад Караткевіча і Мулявіна. Букеты васількоў укрывалі цела пісьменьніка ў труне. Аляксандар Лукашэнка ад'ехаў з сталіцы на час пахаваньня. Дзяржаўныя чыноўнікі на чале зь міністрам Гулякам спрабавалі «афіцыялізаваць» развітальную цырымонію, але пасьля таго, як сын пісьменьніка ўкрыў труну бел-чырвона-белым сьцягам, пакінулі залю. А супрацоўнікі спэцслужбаў зьнялі аблогу з Дому літаратара, узятага імі пад кантроль ад ранку. Стала ясна, што пахаваньне будзе не афіцыйным, а народным. Людзкая плынь заліла вулку ля парку, сквэр на плошчы Перамогі. Тысячы ружаў, гвазьдзікоў, васількоў, сотні вянкоў ляглі на сцэне вялікай залі Дому літаратара.**



IREX-PROMEDIA

Труну выносяць з Дому літаратара.

Пярэдадзень пахаваньня быў трывожны. У аўторак увечары Мікалай Чаргінец і Алег Праляскоўскі паведамілі сябрам пісьменьніка, што труну зь целам дазволена будзе несьці толькі вайсковай варце і на дамавіне не павінна быць бел-чырвона-белай сымболікі. Таксама не дазвалялі несьці труну па вуліцах, нават па плошчы Перамогі. Сябры Быкава былі ў шоку. Літаратары запратэставалі. Рэзка абурылася ўдава пісьменьніка Ірына. «Калі трэба, мы панясём Васіля самі і да самых могілак», — сказала яна ў адказ на «кампрамісны варыянт», у якім насамрэч не было ніякага кампрамісу. Годна, цьвёрда павяло сябе кіраўніцтва Саюзу пісьменьнікаў. Тым ня менш, прадстаўнікі грамадзкасьці чакалі найгоршага і ўвечары распрацоўвалі сцэнары на выпадак, калі ўлада ня пойдзе ні на які сапраўдны кампраміс. Аднак усё павярнулася зусім нечакана.

А 9-й у сераду ўваходы ў Дом літаратара былі перакрытыя амбаламі ў цывільным. Моладзь раздавала людзям на вуліцы бел-чырвона-белыя стужкі з чорным пасам. У памяшканьне прапусьцілі толькі сьвятароў і пеўчых. На жаданьне сяброў пісьменьніка, яго адпявалі паводле ўніяцкага абраду, але да паніхіды з уласнай ініцыятывы далучыліся таксама каталіцкія і праваслаўныя сьвятары. Праўда, ніводнага зь ярархаў не было.

Салдаты паклалі да труны пісьменьніка вянок ад Аляксандра Лукашэнкі, які знаходзіўся ў Сьветлагорску. Прадстаўнікі ўладаў запатрабавалі вынесьці з залі бел-чырвона-белую сымболіку. Родныя Быкава адмовіліся. Калі асобы ў цывільным паспрабавалі сьцягнуць найбольшы штандар, старэйшы сын Быкава Сяргей, адстаўны афіцэр, укрыў бел-чырвона-белым сьцягам бацьку ў труне. «Гэта жаданьне яго як афіцэра», — сказаў ён Чаргінцу. Пасьля гэтага кіраўнік урадавай камісіі па арганізацыі пахаваньня, міністар культуры Леанід Гуляка заявіў, што «ў такім выпадку мы ня можам тут болей прысутнічаць». Разам зь іншымі сябрамі камісіі ды вайскоўцамі ён пакінуў залю.

Пасьля сыходу Л.Гулякі і гэбістаў усе ў Доме літаратара ўздыхнулі з палёгкай: уладзе не хапіла мудрасьці схіліцца перад памяцьцю і воляй пісьменьніка, дык прынамсі хапіла розуму ня шарпаць труны.

Умомант заля расквецілася бел-чырвона-белымі сьцягамі з чорнымі стужкамі. Народу ўсё прыбывала: паасобныя групкі ператварыліся ў ручаінку, а потым у суцэльную людзкую раку, якая расьцягнулася праз усю плошчу Перамогі да мэтро, да вуліцы Захарава. У кветках, вянках патанала сцэна, час ад часу даводзілася пераносіць іх за кулісы — не ставала месца для ганаровай варты. Цела ў труне ўкрылі букеты васількоў.

«Дзяржаўных» і «неафіцыйных» сяброў пісьменьніка ў ганаровай варце напачатку лёгка было ўгадаць па нарукаўных павязках. У першых яны былі чырвона-чорна-чырвоныя, а ў другіх — бел-чырвона-белыя з чорнай стужкай. Праўда, пасьля 11-й «чырвона-чорныя» некуды пазьнікалі, усім сталі павязваць толькі бел-чырвона-белыя…

Час пачатку грамадзянскай паніхіды тройчы адкладалі, бо разьвітальнай чарзе не было канца. Паніхіда трансьлявалася на вуліцу перад будынкам. Віцэ-прэзыдэнт Беларускага ПЭН-цэнтру Валянцін Тарас сказаў, што цяпер ужываньне слова «прэзыдэнт» рэзэрвуюць толькі для аднаго чалавека, але Васіль Быкаў «назаўжды застанецца прэзыдэнтам беларускай літаратуры».

Працяг на старонцы 6.

# Большы за Коласа

Працяг са старонкі 1.

якіх усё беларускае застаецца навечна другасным, ненавідным да невымоўнасьці ў выніку глыбокае псыхічнае траўмы, якую нанесла ім каляніяльная сацыялізацыя. Яны ненавідзяць тое, што ім уяўляецца ганебным стыгматам, і тых, хто «вінаваты» ў іхным калецтве, іхнай «недарускасьці» — беларускім акцэнце і беларускім культурным багажы; ненавідзяць нават тую мову і літаратуру, якія ім прыйшлося вывучаць у школе. Гэтае фашызоіднае пачуцьцё не спыняецца ні перад чым сьвятым і продкавым.

Быкаў раздражняў гэтую публіку сваёй маральнай непрыступнасьцю. Яны не маглі абазваць яго ні паліцаем, ні карупцыянэрам, ні адмарозкам, ні шпіёнам; калі ж абзывалі, іхныя ж словы зьвярталіся супраць іх. Ну дык урэшце яны стараліся звузіць маштаб пахаваньня, бюракратызаваць рытуал, прыменшыць страту — якую страту! Дзівосна эўрапейскага пісьменьніка, палітызаванага экзыстэнцыяліста з разьвітым грамадзянскім пачуцьцём. Два факты, якія я тут нагадаю, далёка не галоўныя ў яганай біяграфіі, але як рэдактару «НН» мне яны дарагія: ён першы з жывых клясыкаў літаратуры рашуча аддаў перавагу незалежнаму выдавецтву «Наша Ніва» перад дзяржаўнымі; ён ганарыўся сяброўствам у вызваленчым Народным Фронце, а пасьля расколу — у абодвух БНФ-ах.

Аглядаючыся назад на Быкава — на нядаўняга Быкава, які ў апошні свой дзень нараджэньня, пасьля двух пераліваньняў крыві спаў на бараўлянскім ложку, нібы дзіця — на кулачку; які, «мякка выштурхнуты» (ягоныя словы) непрыяцелямі і прыяцелямі ў самоту і роспач эміграцыі, захоўваў яснасьць думак, шляхетнасьць эмоцый, і на даўнейшага Быкава, цкаванага камуністамі, а пасьля тымі ж камуністамі падкуплянага ордэнна і ганарарна, — мы бачым вялікі этас вялікага мудраца, які праз сваю праўдзівасьць, волю, антычныя стрыманасьць і ўменьне заставацца нязьменным, ці вакол гучаць хлусьня або праўда, ці ганьба або хвала, зрабіўся найбольшым духоўным аўтарытэтам у Беларусі. Зрабіўся ў час, калі для гэтага не было ніякіх перадумоваў, калі само слова «духоўнасьць» стала нечым накшталт двухколернай абвесткі ў трамваі пра «куплю валасоў ад 35 см і даўжэйшых».

З прыроджанага пэсыміста Быкава старанна робяць сьветача адраджэньня. Але ж даробак пісьменьніка (і нацыяналіста) Быкава — перш за ўсё каштоўны матэрыял для мастацтвазнаўцаў, псыхааналітыкаў, гісторыкаў ідэяў ды іншых земляных чарвякоў культуры. Пранікнуць у гэты матэрыял іх намаўляе не ў апошнюю чаргу безнадзейна неэфэктыўнае выкарыстаньне яго ў якасьці сьветача адраджэньня. Апісваючы рэальнасьць, зь якой большасьць з нас ніколі не сутыкнецца хоць бы ў сілу таго, што пакаленьне Быкава — і яганая проза ў тым ліку — зрабіла войны ў Эўропе зьявамі малаімавернымі і злачыннымі, сапрафагі знойдуць і адказ, чаму гэты народны пісьменьнік Беларусі ня стаў пісьменьнікам сусьветнага маштабу. Цынічная, бязьлітасная праца дасьледчыкаў стварае культурны слой, яна і будзе найлепшым ушанаваньнем мудраца Быкава. Толькі на гэтым культурным слоі і можа ўзрасьці ягоны наступнік.

Этычны талент Быкава быў ня меншы за літаратурны (і заслугоўвае ня меншага вывучэньня). Быкаў быў бясспрэчным маральным аўтарытэтам. Па яганай сьмерці ў краіне не засталося такога бясспрэчнага аўтарытэту, і, па-мойму, гэта надоўга. Найлепшыя зь лепшых адчулі сваю дробнасьць пад гэтай трунай. Але наступнік Быкава некалі выявіцца і здужае больш за яго. Так, як Быкаў здолеў больш за Коласа ў дасьледаваньні чалавечае свабоды і адначасова — у стварэньні этыкі майстра.

**Андрэй Дынько**

# «Адной літаратуры перамагчы

## Недрукаваная гутарка з Васілём Быкавым

**Сябар Васіля Быкава расейскі літаратуразнаўца Валянцін Аскоцкі запісаў гэтую гутарку ў 2002 г., калі пісьменьнік знаходзіўся ў Нямеччыне на запрашэньне Міжнароднага пісьменьніцкага парлямэнту. Сп.Аскоцкі перадаў гутарку ў «Нашу Ніву», мы пераклалі яе на беларускую мову, але яна ня ўбачыла сьвет адразу. Пісьменьнік ня быў задаволены тым, што выйшла з размовы, бо, паводле ягоных словаў, гаварыў ён не як для беларускага чытача, а як для чытача расейскага. Мы прасілі вярнуцца да яе — бачылі ў ёй важнае, — але справа замарудзілася злашчасным пераездам Быкавых у Прагу… Цяпер гэта ўжо памятка.**

**— Ці мог 20-гадовы лейтэнант Васіль Быкаў уявіць сабе, што пройдзе больш за паўвеку па вайне — і ён знойдзе сабе прытулак «у лагве пераможанага ворага», што тут сустрэне сваё 75-годзьдзе?**

**Васіль Быкаў:** — Я скончыў вайну ў Аўстрыі. Што ж да цяперашняга майго знаходжаньня ў Нямеччыне — сьпярша тут, у Шлёс Віпэрсдорф, потым у Франкфурце-на-Майне, цяпер ізноў тут, пад Бэрлінам, — то ў вайну я так далёка не зазіраў. На вайне зранку ня ведаеш, ці дажывеш да вечара, а думаць пра тое, што ды як будзе праз некалькі гадоў, а тым больш праз паўстагодзьдзя і далей, — і ў галаву не прыходзіла. Нават на некалькі дзён наперад я не загадваў.

**— Але маё пытаньне не пра тое. А пра тадышняе і цяперашняе ўспрыманьне Нямеччыны пакаленьнямі, якія ваявалі. Злом гэта ці ня злом у сьвядомасьці, сьветапоглядзе?**

— Стэрэатып ворага, якога трэба ненавідзець і, ненавідзячы, забіць, разбураўся і падчас самой вайны. Іншым разам яна падносіла прыклады, якія ніяк не ўкладаліся ў формулу, у схему абавязковай нянавісьці, якую нам навязалі. Быў выпадак у адной беларускай вёсцы. Мужык пасварыўся і пабіўся з жонкай. Тая ад невялікага розуму — з даносам у нямецкую камэндатуру: муж зьвязаны з партызанамі. Але ў той час у акрузе партызанаў яшчэ не было, так што і сувязяў не магло быць. Што зрабіў камэндант? Па-салдафонску, але выхаваўча. Загадаў высечы жанчыну за паклёп — 25 удараў. І за адным разам 40 удараў мужу — за тое, што распусьціў жонку. Праз нейкі час партызаны і тут аб'явіліся. Па жорсткай іроніі лёсу яны і падстрэлілі мужыка…

Ведаю з аповедаў і такі эпізод з трагічным фіналам, але корань трагедыі таксама ня ў немцах. У невялікім беларускім мястэчку, дзе жыхароў на пералік, утварылася моладзевае падпольле. Наіўныя рамантыкі-маладзёны вялі «палітычна-масавую работу» сярод насельніцтва, як яе разумелі, — ад рукі пісалі ўлёткі і прыклейвалі да платоў хлебным мякішам. Вылічыць і арыштаваць іх не складала цяжкасьці. Адну дзяўчынку дапытваў малады гестапавец. Ці то глянулася яна яму, ці то яшчэ што, але замест таго каб расстраляць дурніцу-падпольшчыцу ці адправіць у канцлягер, ён вывеў яе за аколіцу і адпусьціў: бяжы. Яна і ўцякла, але не дадому, а да партызанаў. Тыя сустрэлі яе насьцярожана, але да канца акупацыі трывалі, балазе ніякіх зачэпак для падазрэньняў яна не давала. Аднак пасьля вайны яе рэпрэсавалі. 12 год правяла на Калыме і ўсё жыцьцё потым кляла чульлівага гестапаўца: каб расстраляў ён яе тады — лічылася б гераіняй падпольнай барацьбы з фашызмам…

У 1980 годзе ў Заходнім Бэрліне ўзьнікла арганізацыя. Яна вызнавала ўзаемны абавязак памяці: і той Савецкі Саюз, і Нямеччына былі ўцягнутыя ў зьнішчальную — хто каго? — вайну, панесьлі шматмільённыя страты з абодвух бакоў. Гэта трагедыя не адной Эўропы, а ўсёй сусьветнай цывілізацыі. Няўжо яна здаўна і назаўсёды асуджаная на такія нязьмерныя ахвяры? Адна справа — лякальныя войны, якія выбухаюць на сьвеце і сёньня. Якімі б жахліва кровапралітнымі яны ні былі, яны несупастаўныя з глябальнымі, міжкантынэнтальнымі войнамі, злавесны цень якіх навісае над XXI стагодзьдзем. Але сутнасьць жа ня толькі ў войнах як такіх, а ў канфліктах, што высьпяваюць і набракаюць да вайны. Так высьпяваў, пакуль не прарваўся вайной, канфлікт дзьвюх таталітарных сыстэмаў — фашызму і камунізму. Іх замірэньне ў жніўні 1939 г., замацаванае змовай Сталіна—Молатава і Гітлера—Рыбэнтропа, было і падманам народу, і самападманным апагеем таемнай дыпляматыі.

**— …Адмову ад якой па-фарысэйску абвесьціў «Дэкрэт аб міры», прыняты ў ноч кастрычніцкага перавароту бальшавікоў.**

— Дэмагогія і цынізм неадлучна спадарожнічалі ўсёй тайнай бальшавіцкай дыпляматыі. І той жа пакт пра савецка-германскую дружбу суправаджаўся сакрэтнымі пратаколамі, існаваньне якіх камуністы настойліва не жадалі прызнаваць аж да перабудовы. І не прызнавалі да таго часу, пакуль камісія пад кіраўніцтвам А.Якаўлева не зрабіла сханае яўным. Было што ўтойваць! Пратаколам прадугледжваўся падзел не адной Польшчы і ня толькі Эўропы, але і ўсяго сьвету. Яны абнадзейвалі *«хеўру танкашыіх правадыроў»* жаданым выхадам да Дарданэлаў. Мара Ўладзімера Жырыноўскага абмыць расейскія боты ў паўднёвых морах нарадзілася не зь ягоным абраньнем дэпутатам расейскай Думы. Калі пасьля другой сусьветнай вайны на Блізкім Усходзе ўтварылася габрэйская дзяржава, СССР першым прызнаў і падтрымаў Ізраіль. Але што рухала Сталіным і яго клікай? Тая ж імпэрская жадоба — выйсьці да цёплых мораў, стаць там *«нагою цьвёрдай»*. Іх адрыжкі даюцца ў знакі і ў новым стагодзьдзі.

**— Ільля Эрэнбург у кнізе «Людзі, гады, жыцьцё» разважае пра тое, як каляндарны пачатак стагодзьдзя не супадае з пачаткам падзейным. Я прыгадаў пра гэта летась 11 верасьня. У дзень падзейнага пачатку XXI стагодзьдзя.**

— Імпэрскі імпэт можа слабнуць. Савецкі Саюз сышоў — вымушаны быў сысьці — з Аўганістану. Пакінуў, адмовіўшыся ад сваіх амбіцыяў, Цэнтральную Азію, Закаўказьзе. Але намертва ўчапіўся ў Паўночны Каўказ, у Чачэнію. Высьпяваюць канфліктныя сытуацыі на Волзе. Невыпадкова ж сакратар Рады бясьпекі Ўладзімер Рушайла правёў там нядаўна нараду па праблемах расейскай бясьпекі. Дый як было не правесьці, калі выявілася, нібыта ісламскія тэрарысты праходзілі навучаньне ня толькі за кардонам, але і зусім пад носам — у Татарстане і Башкартастане.


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**— А як у гэтым кантэксьце выглядае праблема аб'яднаньня Расеі і Беларусі ў саюзную дзяржаву?**

— Расеі яно патрэбнае зь меркаваньняў стратэгічных, хаця я ня ўпэўнены, што яны зразуметыя слушна. А Беларусі? У дакумэнтах, якія падрыхтоўваюць аб'яднаньне, шмат і патасна гаворыцца пра гістарычную еднасьць народных лёсаў, пра роднасную блізкасьць моваў. Але нічога ня сказана пра разьвіцьцё нацыянальнай культуры, нацыянальнай мовы ў Беларусі.

З чаго пачала сваю дзейнасьць новая галоўная рэдактарка часопісу «Нёман» Ніна Чайка, узнагароджаная гэтай пасадай за актыўны ўдзел у перадвыбарчай прэзыдэнцкай кампаніі, калі яна мабілізоўвала жаночы электарат Лукашэнкі? З таго, што зьняла з чарговага нумару прынятыя да яе прыходу публікацыі Бураўкіна, Быкава — маю гутарку з акадэмікам Барысом Кітом. Між іншым, гэта волат беларускай навукі. Паводле адукацыі матэматык, прафэсар, доктар філялёгіі і гісторыі, віцэ-прэзыдэнт Міжнароднай эўрапейскай акадэміі астранаўтыкі… Ходзяць чуткі, што яна ж мае намер друкаваць раман Аляксандра Праханава «Спадар Гексаген»*.

**— Значыць, фантасмагорыі «агнявых мэтафар» Аляксандра Праханава для іх больш патрэбныя за суворую праўду ваеннага і сучаснага быцьця ў прозе Васіля Быкава?**

— Ну, што датычыць апошняга, то яго адлучылі ня толькі ад «Нёману». Мікола Мятліцкі, новы галоўны ў «Полымі», паставіў публікаваньне Быкава непасрэднай віной свайму папярэдніку Сяргею Законьнікаву. У тым ліку публікацыю апавяданьня «Труба». На яго люта апалчыўся і пісьменьнік, які служыць цяпер у Адміністрацыі прэзыдэнта, Эдуард Скобелеў. Газаправодныя трубы, выкрываў ён, патрэбныя народнай гаспадарцы. А ў паклёпніка Быкава да таго дайшло, што ў трубу чалавека заварваюць… Між тым выпадак такі быў, я яго не прыдумаў. Некалькі чалавек чакалі канца дажджу ў трубе, а будаўнікі газаправоду, не здагадваючыся пра гэта, іх заварылі. На шчасьце, не як у аповедзе, усе выйшлі. Прэзыдэнцкага дарадцу Скобелева аспрэчыў Генадзь Бураўкін і тут жа паплаціўся за свой артыкул у маю абарону. Паехаў на сустрэчу з чытачамі, а выступ ягоны адмянілі, не палічыўшы патрэбным папярэдзіць загадзя.

**— Значыць, і ён цяпер пад забаронай?**

— Такія забароны ў нас — зьява будзённая. Яны арганічна ўпісваюцца ў духоўную атмасфэру, якая пануе ў Рэспубліцы Беларусі. «Чужых» забараняюць і адлучаюць, «сваіх» прыграваюць і апякаюць. Як генэрала Ўсхопчыка, намесьніка міністра абароны Беларусі. Ён кіраваў штурмам віленскай тэлевежы, і літоўцы патрабуюць выдаць яго для сьледзтва і суду…

**— Заканамерна патрабуюць!..**

— …А Лукашэнка «заканамерна» не выдае. Затое яго зусім не хвалююць зьнікненьні людзей як мэтад ціхай расправы зь іншадумцамі-апазыцыянэрамі. Ня так даўно ўцёк на Захад начальнік сьледчага ізалятару. Зьвёз з сабой дакумэнты, якія давялі да агульнага ведама, абнародавалі… Дарэчы, напярэдадні нашых прэзыдэнцкіх выбараў гэтыя дакумэнты былі пераасланыя Пуціну — ніякай рэакцыі.

**— Чуў быў, што сёньня ў Беларусі дзіцяці даводзіцца расплачвацца за бацькоў, сыны становяцца адказчыкамі за бацькоў, як быццам «закладнікамі». Ці ня гэта дало іскру, паслужыла першаштуршком для нядаўняй аповесьці «Балота», якая, па сут-**

* Гутарка запісвалася да таго, як выйшаў №6—7 часопісу «Нёман» з раманам А.Праханава.

# не пад сілу таталітарызм»

**насьці, паўтарае тэму аповесьці «Круглянскі мост»? І там, і тут ліхія камандзіры жорстка і цынічна ахвяруюць жыцьцямі падлеткаў…**

— Новая аповесьць сапраўды ў нечым паўтарае папярэднюю. Але паўтарае тэматычна, а не сюжэтна. Сюжэты абедзьвюх зададзеныя мноствам безвыходных сытуацыяў партызанскага гераізму дзяцей, ад якога дарослыя дзядзькі, калі б не былі бяздушнымі прагматыкамі, зашоранымі так званай «карысьцю справы», ня толькі павінны былі, але й мусілі ўберагчы.

**— А наколькі вялікая роля дакладнага факту, сапраўднага эпізоду ў сюжэтах ваеннай і ня толькі ваеннай прозы Васіля Быкава? Аповесьць «Мёртвым не баліць», якая пісалася «як успамін, там амаль усё, што датычыць сюжэту і абставінаў, — дакумэнтальна», — таўравалі за перакручваньне праўды. І нават за ачарненьне, паклёп.**

— Тое, што здаралася на самай справе, вельмі часта так ці іначай уваходзіць у апавяданьне ці аповесьць. Неабавязкова фактаграфічна. Хутчэй — у перайначаным выглядзе, са зьменай характараў і абставінаў.

Распавяду, да прыкладу, пра драму нядаўна памерлага паэта Анатоля Іверса. Да вайны ён працаваў у слонімскай раённай газэце. З пачаткам вайны рэдакцыя эвакуявалася, а для ягонай сям'і не знайшлося месца. Праз гэта ён і застаўся ў акупацыі. Сьпярша жыў маўчком ды цішком на хутары. Але як-ніяк, а былы савецкі работнік, і партызаны выйшлі на сувязь зь ім. Паставілі задачу: трэба «ўнядрацца». Пранік на працу ў гарадзкую ўправу, і супраца зь ім наладзілася сталая. Дарэчы, у мясцовых управах тады шмат хто выконваў такія заданьні. І самі ўкараняліся, і іншым дапамагалі. Дзякуючы свайму знаходжаньню не ў самой акупацыйнай уладзе, але блізка ад яе, яны маглі падтрымліваць некаторыя партызанскія акцыі, дапамагаць падпольлю, прыкрываць яго, спрыяць вызваленьню вязьняў, замінаць масавым мабілізацыям у Нямеччыну. Іверс працаваў ува ўправе, а ягоны сябра Багданчук, таксама ўкаранёны ў адміністрацыю, ні мала ні многа — у сьледчым аддзеле СД. Так ішло сваёй чаргой — абодва рабілі адну справу, выконвалі партызанскія заданьні. Урэшце Іверса выкрылі, сам ён выжыў, але сваякоў, праз якіх застаўся ў акупацыі, страціў. Багданчук жа атрымаў чарговае заданьне: зьнішчыць сям'ю хутараніна, якога за супрацоўніцтва зь немцамі палічылі за здрадніка. Заданьне ён выканаў, сям'ю зьнішчыў. Забіў усіх, апроч маленькай дзяўчынкі, якая, калі ён прыйшоў на хутар, пасьпела схавацца. Дзяўчынка вырасла і праз 20 гадоў пазнала Багданчука ды паказала на яго як на расстрэльніка сям'і. Арыштавалі абодвух — і Іверса, і Багданчука. Былых партызанскіх камандзіраў, якія маглі сьведчыць у іхнюю карысьць, да сьледзтва не прыцягвалі: каго ў жывых ужо не было, а іншых дык і не імкнуліся знайсьці. І ніякіх дакумэнтаў не захавалася — не вялі партызаны дакумэнтацыі па ўліку ўкаранёных у гітлерскую адміністрацыю кадраў. Ад Іверса запатрабавалі выкрыць Багданчука, пацьвердзіць ягоны ўдзел у злачынствах карнікаў. Ён адмовіўся. З-за кратаў выпусьцілі, але з працы выгналі. Пайшоў на смалакурню, дзе й зарабляў на хлеб шмат гадоў. А Багданчуку за здраду радзіме і супрацоўніцтва з гітлераўскімі акупантамі ўпаялі 15 гадоў. На пачатку перабудовы Іверс прыяжджаў у Горадню, прывёз і паказаў паперу з пракуратуры аб адсутнасьці складу злачынства. Пра лёс былога сябра ня ведаў нічога.

**— Багданчук — ахвяра нечувана бесчалавечных абставінаў. Але ўласнаручна, на загад, расстраляць сям'ю… Ды няхай бацька і сапраўды здраднік, дзяцей завошта?**

— Хіба я спрачаюся? Пра іншае гаворка. Пра тое, што гуманныя прынцыпы вайна ў разьлік не бярэ, яна зьняцэньвае чалавечае жыцьцё, і жыцьцё дзяцей таксама. Не пакладзі Багданчук сям'ю сапраўднага ці ўяўнага здрадніка, сам бы хадзіў у здрадніках, праўда нядоўга: яго прыбралі б умэнт. А так у вачах партызанаў — герой, які ня проста выканаў баявое заданьне, але з рызыкай для сябе выканаў абавязак, зьдзейсьніў подзьвіг. Да таго ж зьнішчэньне сям'і сьпісалі на карнікаў-немцаў. Нібыта гэта нешта мяняла ў лёсе загінулых дзяцей, нібыта ім ад гэтага лягчэй!..

**— Дык што: гэтай трагедыяй і падказана, высечана задума аповесьці «Ў тумане»? Два партызаны выходзяць зь лесу з заданьнем расправіцца з чалавекам, вінаватым толькі ў тым, што з гестапаўскага засьценка ён выпушчаны пабітым, але жывым…**

— У пэўнай ступені. Ці менавіта ў той, у якой падазрэньні ў здрадзе — заўсёды хуткія, але не заўсёды справядлівыя расправы са здраднікамі, як сапраўднымі, так і ўяўнымі, — тыповыя для партызанскага мінулага. А значыць, і прататыповыя. Але ў аповесьці важны яшчэ адзін матыў: выпускаючы Сушчэню, гестапаўцы шахматна пралічылі: партызаны самі заб'юць яго як нібыта здрадніка, але, забіваючы, мо дадуць магчымасьць выйсьці на іх сьлед.

**— А ці былі «прататыповыя» рэаліі, што паклікалі да жыцьця адзін з частых для Васіля Быкава сюжэтных матываў: франтавы выпадак сутыкае савецкага і нямецкага салдата і кожны па-свойму выпрабоўваецца блізкасьцю ворага? На гэтым цалкам пабудаванае даўняе апавяданьне, дзе два салдаты — рускі і немец — апынаюцца ў сутарэньні, якое замуравала выбухам бомбы…**

— Падобная гісторыя здарылася ў палку, у якім я ваяваў. Адбылося гэта ў Вугоршчыне. У лёху апынуліся нямецкі обэр-лейтэнант і наш салдат. Абодва параненыя. Абодва насьцярожана сочаць адзін за адным, але не страляюць, бо ня ведаюць, хто наверсе. А наверсе былі немцы. Яны і знайшлі абодвух пасьля бою. Немец перавязаў нашага і спытаў, куды ён хоча: у палон ці да сваіх? Вядома, да сваіх! Яго паклалі на плашч-палатку і перацягнулі бліжэй да нашых акопаў, а далей ён сам дапоўз. Трапіў у шпіталь. І там расказаў пад сакрэтам камусьці, што ды як зь ім здарылася. Пасьля гэтага ў палку яго ўжо ня бачылі. Згінуў. Нітачка да апавяданьня, пэўна, адсюль.

— **І гэтая, і іншыя падзеі высьвечваюць яшчэ адну скразную тэму — лютасьць маралі, размыў сыстэмы каштоўнасьцяў. Вайна заклікала да пільнасьці. Але пільнасьць зьвялі да агульнага недаверу. У здрадзе, шпіёнстве падазравалі ўсіх і кожнага.**

— На самым пачатку вайны я быў сьведкам жудаснай сцэны: разьюшаны натоўп лінчаваў чалавека, які толькі што спакойна чытаў газэту на стэндзе. У ягонай руцэ таксама была газэта — ён прыкрываўся ёю ад сонца. Камусьці здалося: шпіён, падае сыгналы самалётам. Тут жа знайшлі аргумэнт: паглядзі, якія ў яго чаравікі. Чаравікі й сапраўды не скараходаўскай вытворчасьці. Ён прыехаў у іх з Львова, адкуль быў эвакуяваны. Газэту «Праўду» ён купіў па дарозе ў ваенкамат — позву аб прызыве знайшлі потым у кішэні…

Гэта ў вайну. Але тое самае і пасьля вайны, ужо ў нашыя 70-я. Завялі пэрсанальную справу на Аляксея Карпюка. Дарма што пісьменьнік, партызан, уцёк зь нямецкага канцлягеру. Адкапалі ў нейкім архіве лягерную ведамасьць зь ягоным подпісам у атрыманьні 15 марак. Што за маркі, адкуль? Ён свой подпіс прызнае, а патлумачыць нічога ня можа — забыўся. Але калі ад подпісу не адмаўляецца, значыць, пацьвярджае, што супрацоўнічаў з гестапа. Справа дайшла да бюро ЦК КПБ. Там вырашылі выключыць з партыі.

Машэраў пры галасаваньні ўстрымаўся і прапанаваў накіраваць справу на дадатковае расьсьледаваньне. Тым часам у Горадню прыехаў польскі журналіст, які ведаў Карпюка па мінулым камсамольскім падпольлі. Яго атакавалі ананімнымі званкамі, папярэджвалі, каб ня знаўся з гестапаўскім прыслужнікам. Але ён ня слухаў пагрозаў і дакапаўся да праўды. Злашчасныя 15 нямецкіх марак пераялі на пракорм сваякі Карпюка — у некаторых нямецкіх лягерах такое дазвалялася. Канцлягернае начальства яму гэтых грошай ня выдала, але расьпіскі запатрабавала. Таму ён і забыўся на гэта. Такія вось справы шыліся людзям, прычым паважаным, аўтарытэтным, тым, хто навідавоку; ужо не ў вайну і не ў пасьляваенныя сталінскія, а брэжнеўскія гады разьвітага сацыялізму.

Камуністычная ідэалёгія завяла ў тупік ня толькі эканоміку, стрыжнем якой было бясконцае нарошчваньне ўзбраеньняў. Не ў адначасьсе, а дзесяцігодзьдзямі яна разбурала мараль, вытручваючы са сьвядомасьці людзей прынцыпы хрысьціянскае маралі. З наступствамі гэтай таталітарнай патравы мы раз-пораз сутыкаемся і да гэтага часу, хаця няма ўжо ні СССР, ні КПСС зь яе роляй стырнавога розуму, гонару і сумленьня эпохі. Узяць хоць бы палкоўніка Буданава — яўны злачынца: зганьбаваў, забіў. А Фэміда праводзіць экспэртызу за экспэртызай, намагаючыся апраўдаць злачынства непрытомным станам.

**— Значыць, распад СССР — непазьбежнасьць гісторыі, а не зламысныя падкопы закуліснай змовы здраднікаў, Гарбачова зь Якаўлевым ці Ельцына з Бурбулісам?**

— Нацыянал-бальшавіцкая прапаганда выстаўляе аб'ектыўны ход гісторыі такім немудрагелістым: сабраліся трое ў Белавескай пушчы, выпілі ці не на брудэршафт і на п'яную галаву развалілі «народаў братэрскі саюз». Але калі б ён быў сапраўды братэрскі — не разваліўся б. А тое, што развалілася па волі гісторыі, рэанімаваць аніякімі намаганьнямі немагчыма. Думаю, гэта выразна ўсьведамляў Гарбачоў, якога я асабіста лічыў і лічу вялікім чалавекам. Ён жа ж мог выкарыстаць супраць «белавежцаў» сілу. Ня выкарыстаў. Палічыў за лепшае сысьці. І сышоў годна — учынак неардынарны.

Мне помніцца сустрэча Гарбачова з інтэлігенцыяй у 1988 г. На ёй прысутнічала чалавек дзьвесьце. Для большасьці зь іх было нечаканым ягонае пытаньне: што адбылося ў Менску? Адбылося ж вось што. У Беларусі ўзьнік Народны фронт. А праз дзень пасьля яго заснаваньня — сьвята «Дзяды» з абрадамі памінаньня памерлых. Тады ж адкрылася жудасная праўда Курапатаў і чакалася шэсьце да гэтага месца масавых расстрэлаў. Народны фронт прыняў пастанову: арганізацыю ён на сябе не бярэ, але ў Курапаты хай ідзе кожны, хто лічыць гэта абавязкам памяці і сумленьня. Усё скончылася трагічна: разгонам шэсьця, зьбіцьцём дэманстрантаў. Генэрал міліцыі, які кіраваў расправай, атрымаў потым падвышэньне. Дзіва што: прадставіў маніфэстацыю як мяцеж супраць перабудовы. Віктар Астаф'еў назваў усё гэта «штучкамі» КДБ і партыйных уладаў. Пра такія «штучкі» я і напісаў Гарбачову. Так што ягонае пытаньне на сустрэчы было адказам на мой ліст…

З кнігі Андрэя Грачова, ягонага прэс-сакратара, я даведаўся, якую ролю адыграў Міхаіл Сяргеевіч у маім пісьменьніцкім лёсе. Аказалася, што абмеркаваньне аповесьці «Знак бяды» стаяла на парадку дня аднаго з паседжаньняў палітбюро. Чэбрыкаў заявіў рашуча: друкаваць яе нельга. Гарбачоў запярэчыў: нельга не друкаваць. Дэмакратычны струмень згорне хвалю плётак, якіх баіцца КДБ. У сутнасьці, ён санкцыянаваў публікацыю аповесьці. Прычым у супрацьвагу ня толькі Чэбрыкаву, але і Лігачову: той патрабаваў зьняць сцэны калектывізацыі калі ня з кнігі, то хаця б зь фільму, які ставіў Міхаіл Пташук. А тым часам блізілася маё 60-годзьдзе. Сьлюнькоў, які прыйшоў на месца Машэрава, пытаўся ў Масквы, як адзначыць юбілей, чым узнагародзіць юбіляра. Гарбачоў настаяў даць героя сацыялістычнай працы. І падпісаў указ. Я пра гэта, як той казаў, ні сном, ні духам…

**— Часта прыгадваю развагі Адамовіча: што б ні было далей з Гарбачовым, ягоная гістарычная заслуга бясспрэчная. Ён вызваліў нас ад боязі перад вайной, прымусіў паверыць, што трэцяй сусьветнай вайны зь яе самазабойнымі ядравымі ўдарамі можна пазьбегчы.**

— А я пацьвярджаю гэта ўражаньнямі ад паездкі ў ЗША. У ёй, дарэчы, быў і наш сябар, нябожчык Ігар Дзядкоў. Гарбачоў тады выступаў у ААН. І ўпершыню казаў пра агульначалавечыя вартасьці. Напэўна, пры падтрымцы А.Якаўлева, які па вяртаньні з Канады ня раз заяўляў, што русацяпы выгналі панятак агульначалавечых вартасьцяў, перакруцілі, угнюсілі іх, падрабілі пад свой імпэрскі, вялікадзяржаўны шавінізм.

**— Вернемся да літаратуры. І ў прыватнасьці, да тэмы культурнае спадчыны, ад якой нам сёньня ня варта было б адмаўляцца, цалкам перакрэсьліваючы ўсё, што стваралася ў савецкія тры чвэрці стагодзьдзя. Што можна сказаць у сувязі з гэтым пра беларускую літаратуру савецкага пэрыяду?**

— Беларуская літаратура ў савецкія і асабліва ў пасьлясталінскія дзесяцігодзьдзі паднялася на ўзровень, якога раней ня ведала.

**— Дзякуючы ці насуперак рэжыму?**

— Літаратура тады нечага вартая, калі яе не за аброць вядуць, калі яна ствараецца насуперак. Высокія набыткі літаратуры супрацьстаяць таталітарызму, апазыцыйныя яму. Але ўсё-такі ня ўся літаратура і не грамадзтва цалкам, нават не дэмакратычная частка грамадзтва. Былы прэзыдэнт ЗША Картэр наведаў Кубу, сустрэўся зь Фідэлем Кастра. І вынес уражаньне: біялягічнай зброі Куба не выробляе. Ну і што з таго? Хіба пры гэтым кубінскі рэжым перастае быць дэспатычным? Дэмакратыя часта лагодная і бяззбройная проці таталітарызму і не шукае адэкватных сродкаў барацьбы зь ім. А адной літаратуры знайсьці іх не пад сілу.

*(скарочана)*

**Гутарку вёў**
**Валянцін Аскоцкі**
Шлёс Віпэрсдорф — Бэрлін.
Травень 2002


IREX-PROMEDIA

# Хаваў народ

Працяг са старонкі 3.

Сябар і перакладчык Быкава на нямецкую Крыстаф Хойбнэр заявіў: «Творчасьць і імя Быкава назаўсёды застанецца ў нямецкай літаратуры, бо ён паказаў немцам, што яны тварылі ў час вайны». «Хачу запэўніць Васіля Быкава, што ягоная справа і барацьба за свабоду і незалежнасьць Беларусі будзе намі працягнутая», — паабяцаў кіраўнік дэпутацкай групы «Рэспубліка» Сяргей Скрабец. Украінскі пісьменьнік Вячаслаў Мядзьведзь нагадаў, што на ўкраінскай зямлі, пад Кіраваградам, дзе ваяваў Быкаў, на брацкай магіле засталося напісанае ягонае прозьвішча: «Для звычайнага чалавека гэта было б трагічна, а для такога вялікага чалавека гэта Боскі знак». Пасьля паніхіды ля труны на хвілінку засталіся толькі сваякі нябожчыка.

На могілкі Быкава панесьлі на руках. Параперадзе — несканчоная калёна вянкоў, за імі труна, у ёй сьветлысьветлы дзядзька Васіль, укрыты сьцягам. Многія на вуліцах хрысьціліся на труну, як на абраз.

Рух па праспэкце перакрыўся сам сабою, і сярод пахавальнай працэсіі ўтвараецца вялізны аўтамабільны «корак». Кіроўцы стаяць спакойна, час ад часу сыгналячы доўгімі журботнымі гудкамі. Некаторыя выходзяць з машынаў. З даху Філярмоніі глядзяць будаўнікі, людзі стаяць на ўзбочынах, у вокнах... За плошчай Якуба Коласа труну зь целам Васіля Быкава ставяць у аўтобус, туды ж сядаюць і блізкія. Труну несьлі б да самых могілак, але ўдаве Ірыне і сястры Валянціне цяжка было б адолець гэты шлях пешшу. Хада працэсіі паскараецца. Перад людзьмі шматкілямэтровы шлях праз увесь горад.

17.50. У браме могілак хор сустракае працэсію гімнам «Магутны Божа». Магіла пад хвоямі чакае. На могілках стала блага сястры Васіля... Ёю заапекаваліся дактары «хуткай дапамогі».

Над Менскам ад абеду зьзяла сонца замест абяцанага сыноптыкамі дажджу. Менскія расейскамоўныя FM-станцыі не далі і элемэнту стрыманасьці ў свае трансьляцыі, а вось беларускія тэлеканалы ўнесьлі зьмены ў сетку вяшчаньня. Затое рэпартаж з пахаваньня «Панарама» падала толькі ў 21.23 пасьля паведамленьня з Талачынскага лясьніцтва. У інтэрпрэтацыі БТ улады прапанавалі ўшанаваць памяць Быкава без палітызацыі, і «родственники писателя в целом были согласны с предложениями властей», але апазыцыя «згубіла агульначалавечыя каштоўнасьці» і ператварыла ўсё ў дэманстрацыю.

Дзяржаўныя чыноўнікі ня мелі сьмеласьці пастаяць пад бел-чырвона-белымі штандарамі. А.Лукашэнка зрабіў буйную палітычную і маральную памылку, не знайшоўшы магчымасьці асабіста разьвітацца з Быкавым. Беларуская нацыя застаецца разьяднанай. Але адно з найбуйнейшых пахаваньняў нашага веку прайшло хораша, сонечна, годна.

**Мікола Бугай, Аркадзь Шанскі, Сяргей Мікулевіч**

# Жыць па Быкаву

Амаль паўстагодзьдзя, пачынаючы з часу, калі ў друку зьявіўся «Жураўліны крык», мы жывём па хранамэтры Быкава. Рэдкасная рэгулярнасьць, зь якою публікаваліся ягоныя творы, нагадвала працу астранамічнага гадзіньніка. Не патрабавалі тлумачэньня словы: тое было, калі Васіль Быкаў надрукаваў... «Мёртвым не баліць»... «Сотнікава»... «Знак бяды»... Гэты пералік папаўняўся апошнім часам сумнымі падзеямі: ...калі Быкаў быў змушаны зьехаць за мяжу... І апошняя Падзея: калі Быкаў вярнуўся ў Беларусь назаўсёды.

Адкрыцьцём генія Быкава сталася адкрыцьцё Часу ва ўсіх рэаліях нашага зямнога існаваньня і радыкальнае сьцьвярджэньне яго магчымасьцяў, якіх да Быкава ня ведала сусьветная літаратура. Гэта і паняцьце незваротнасьці — калі застаецца адно шкадаваць аб упушчаных магчымасьцях, аб чым беларусы ведаюць лепш чым хто. Гэта і паняцьце выбару, якое звужаецца да дылемы: быць альбо ня быць — нацыі, мове, самому жыцьцю. Гэта і паняцьце абсурду, калі зьнікае аптымістычная спадзяванка на шчасьлівы зьбег акалічнасьцяў і як багадаць зьяўляецца пачуцьцё рэальнасьці ды маральнай адказнасьці, разуменьне сваіх кволых чалавечых магчымасьцяў у супраціве хаосу і велічы чалавечага духу.

Знакавы загаловак даўняга артыкулу ў «Правде»: «Калі адстаюць ад часу». Мелася на ўвазе, што Васіль Быкаў, Аляксандар Твардоўскі, Аляксандар Салжаніцын (з названых, а былі ж яшчэ і неназваныя) «адсталі ад часу» і што іхняя «запозьненая» прага праўды не адпавядае «генэральнай лініі партыі». Адсталі ад часу якраз аўтары сумнапомнага опусу, якія нават у тыя часы пабаяліся назваць сябе. Менавіта Час зь яго лінейным разгортваньнем уносіць парадак у сьвет, у якім столькі ахвотнікаў ускаламуціць ходу падзеяў. Ідэі Быкава трансфармаваліся ў памяць, сталі рэальнай сілай, якая ўрэшце адолее марныя патугі дачасьнікаў любога рангу, надзіва недальнабачнай улады стрымаць ходу гісторыі, разарваць сувязь паміж мінулым і будучыняй, назваць Генія проста «чалавекам», а «проста чалавека» ўзьвесьці на Алімп.

Васіль Быкаў ужо ў Вялікім Часе гісторыі. Ня толькі мінулай, але і будучай. Мільёны яго чытачоў зьвяралі свае гадзіньнікі па Быкаву, шукалі магчымасьці жыць па Быкаву, вучыліся крочыць упоравень з векам і не баяцца страшнай ходы часу. Жыць па Быкаву — гэта звышзадача дня і вечнасьці. Адпавядаць ёй — што яшчэ застаецца нам, асірацелым, расьсеяным, як авечкі без свайго пастыра!

**Міхась Тычына**

# Не губляць твару

**Кіраўнік Гуманітарнага ліцэю Ўладзімер Колас быў адным з апошніх, хто сустракаўся з Васілём Быкавым.** 21 чэрвеня ён наведаў пісьменьніка ў бараўлянскай рэанімацыі. Быкаў заўжды шчыра цікавіўся ліцэйскімі навінамі, сачыў за дзейнасьцю гэтай установы. Яшчэ ўвосень 1990 г. ён сустракаўся з слухачамі ліцэю, які тады быў недзяржаўным і толькі нядзельным.

**«НН»: Якой была тая першая сустрэча?**

**У.К.:** Мы глядзелі фільм «Адна ноч», які я зрабіў паводле апавяданьня Васіля Быкава. Пра няправедны загад і выбар чалавека, якому аддаецца гэты загад. Выканаць ці паслухацца голасу свайго сумленьня? Тады адказы на гэтыя пытаньні можна было пачуць хіба толькі ад Быкава.

**«НН»: У палату да Быкава апошнія дні было цяжка прайсьці. Як Вы патрапілі туды?**

**У.К.:** Пазваніў Уладзімер Пузыня і сказаў, што дамовіўся з знаёмым лекарам. У палаце была яшчэ жонка Быкава. Пісьменьніку цяжка было размаўляць. Ён спытаў, як там ліцэй. Я сказаў, што мы бяром сілы і мудрасьць зь ягоных кніг, стараемся жыць паводле маральных законаў, якія ён прапісаў у сваіх творах. Быкаў прасьвятлеў і ўсьміхнуўся. А потым У.Пузыня пайграў яму на дудцы. Быкаў заплюшчыў вочы і сказаў: «Вой, як хораша».

Было вельмі нялёгка бачыць, як такая асоба сыходзіць.

**«НН»: Што раіў Васіль Быкаў выкладчыкам і навучэнцам Беларускага ліцэю?**

**У.К.:** Ён сказаў: «Вам цяпер галоўнае — не згубіць свой твар». Гэта нам наказ. І цяпер мы ня маем права ператварацца ў нешта іншае ды нішчыць сваімі рукамі створанае.

**Гутарыў АШ**

# Празорца нацыі

Вялікае бачыцца на адлегласьці. Але ўжо сёньня мы разумеем, што страцілі генія. Генія нашай літаратуры. Нацыянальнага празорцу і прарока.

Прароцтвы Васіля Быкава ніколі не былі сьветлымі. Будзем спадзявацца, што ня ўсе зь іх спраўдзяцца. Аднак яны мусілі гучаць, каб засьцерагаць нас ад аблуды й трагедыі.

Ува ўсе часы ўлада няўменна больш любіла не жывых, а мёртвых геніяў. «Нашая» ўлада нядатная нават на гэта. Напэўна таму, што вэрдліва ўсьведамляе: некалі яе ў найлепшым разе мімаходзь узгадаюць надобрым словам, а ў гісторыі й памяці Беларусі навечна застанецца БЫКАЎ.

**Уладзімер Арлоў**

# Быкаўскія паходні

Тры гады таму ў Магілёве судзілі Васіля Быкава. Дакладней, судзілі газэту «Тыднёвік Магілёўскі» і аднаго зь яе аўтараў, які ўзяўся бараніць творы Быкава ад купкі камуністаў. Тыя лічылі, што гэтыя творы трэба выключыць з школьных праграм, бо яны «скажаюць праўду пра вайну».

Дванаццаць гадоў таму камуністычная сыстэма дагніла і развалілася. Гэты развал адбыўся б значна раней, але дапамог нямецкі фашызм, які разьвязаў другую сусьветную вайну. На яе можна было сьпісаць эканамічныя правалы, а неабходнасьцю бараніць радзіму ад агрэсара ўзьняць народны энтузіязм. Што і было зроблена.

Перамога ў вайне, якую самаахвярна здабыў народ, нягледзячы на глупства і шкодніцтва сваіх навязьлівых правадыроў, стала адзіным рэальным дасягненьнем камуністычнага пэрыяду. Дасягненьнем, у якім ні кроплі камуністычнай заслугі не было. «Заслугай» камуністычных лідэраў былі толькі шматмільённыя чалавечыя страты. Але камуністы прыватызавалі Перамогу. Сьпешна сталі распрацоўвацца ваенныя міты.

Міталёгія ўкладалася ў вушы ідэолягам, настаўнікам, журналістам, пісьменьнікам. Апошнія павінны былі выконваць партыйную замову — ствараць оды, раманы, апвесьці і даводзіць іх да вушэй народных масаў. Праблему для партыйных ідэолягаў стварылі сумленныя пісьменьнікі, якія асьмельваліся пісаць і гаварыць пра вайну праўду. Васіль Быкаў — самы прыкметны з такіх пісьменьнікаў. Ён — разбуральнік камуністычных мітаў аб вайне, апошняга апраўданьня ідэалёгіі. Ён прадраўся праз утаймавальнае павуціньне, дасягнуў шырокай вядомасьці, і яго ўжо нельга было змарнаваць у ГУЛАГу ці выштурхнуць за мяжу. Не ўдалося яго залагодзіць і ганаровымі званьнямі. І пачался цкаваньне, якое ня скончылася і па сёньня.

Ужо і маналітнай КПСС няма, і пра Палітбюро ўжо шмат хто ня помніць, але некаторыя з былых камуністаў працягваюць ранейшае змаганьне. Вольныя дні пэнсійнага жыцьця ці пасада, якая дае някепскі заробак ды пакідае шмат вольнага часу, — і вось разварочваецца бурная дзейнасьць: ствараюцца нейкія саюзы-асацыяцыі, ад іх імя рассылаюцца пісьмы-патрабаваньні — у міністэрствы, у Акадэмію навук, у Адміністрацыю прэзыдэнта, куды толькі можна — з подпісамі «старшыня асацыяцыі», «вэтэран-падпольшчык» для моцы. Пісьмаў шмат, хаця аўтары часьцей адны і тыя ж, і ствараецца ўражаньне масавасьці патрабаваньняў. А каб падмацаваць такое ўражаньне, зьбіраюцца «круглыя сталы» для абмеркаваньня гэтых пісьмаў, што і статус пісьмаў узвышае, і ствараe бачнасьць масавай падтрымкі (ня важна, што людзі казалі на сходзе, важна, што яны прысутнічалі). Большасьць вэтэранаў, якіх намінальна ўцягваюць у такія асацыяцыі, не падазраюць, якія мэты прыкрываюцца іхнымі імёнамі. І калі ім паведамляеш, зьдзіўляюцца і абураюцца.

Гэтыя акцыі маюць на мэце, пад выглядам барацьбы за патрыятызм, вярнуць у школьныя праграмы літаратурныя творы, складзеныя адпаведна напаўзабытым камуністычным мітам, і забараніць творы, што супярэчаць мітам, вярнуць камуністычны погляд на гісторыю. І вось ужо міністэрства вымушана рэагаваць на «патрабаваньні вэтэранаў» абмежаваць вывучэньне твораў Быкава.

Але быкаўская праўда прарастае праз накіданае ідэалягічнае сьмецьце і прымушае думаць аб змаганьні высакародзтва і подласьці ў душы *кожнага* чалавека — падчас вайны ці ўжо й безь яе. І тое, што савецкія ідэолягі лічылі геройскім, сёньня можа зьмяніць ацэнкавы знак.

Вось рэальная сытуацыя. Фашысты, заняўшы вёску, пакідаюць у ёй гарнізон зь пяці чалавек і ідуць далей. Папярэджваюць жыхароў: калі гарнізон будзе зьнішчаны, то вёска будзе спалена і жыхары яе пастраляныя. Ночу прыходзяць два дзясяткі партызанаў, спраўцца з маленькім гарнізонам ім няцяжка, у справаздачы наверх яны смакуюць падрабязнасьці, як голыя гітлераўцы выскоквалі з вокнаў і напорваліся на штыкі. А тое, што вёска спалена і жыхары яе пазабіваныя фашыстамі?..

А тое, што прыдуманаму Кулешовым камсамольцу, які замярзаў, прыціскаючы да сэрца білет, ёсьць рэальны антыпод — малады партызан, які пад пагрозай расстрэлу адмаўляўся ўступаць у камсамол (пра гэты выпадак расказвала «НН»)? «Гэта адзінкавы выпадак!» — крычала мне сівая жанчына, былая партызанка. Нібыта кулешоўскі камсамолец быў выпадкам масавым.

Таямніцы вайны яшчэ чакаюць сваіх унікіёвых дасьледчыкаў. І творы В.Быкава — як паходні для такіх дасьледчыкаў.

**Міхась Булавацкі, Магілёў**

Рэспубліканскае грамадзкае аб'яднаньне «Беларускі ПЭН-цэнтар», Міжнародны ПЭН-клюб, Нарвэскі ПЭН-Цэнтар, Расейскі ПЭН-Цэнтар, Украінскі ПЭН-Цэнтар, Фінскі ПЭН-Цэнтар, Швэдзкі ПЭН-Цэнтар смуткуюць з прычыны сьмерці Васіля Быкава, прэзыдэнта Беларускага ПЭН-Цэнтру, слаўнага сына свайго народу. Спачывай, Васіль.

Людка Сільнова

* * *

Яму ўвесь шар зямны магілай,
Нібы герою з даўніны!
Сьсівеў наш васілёк. Васіль наш
Пайшоў у мірны сьвет з вайны.

Марына Наталіч

## Плач па Васілю

Запалю я сьвечачку, запалю
Па душы-вандроўніцы — Васілю.

Рос у полі кветкаю-васільком,
Адляцела душачка галубком.

А ці лёгка ў вырай ёй адлятаць,
Ці ня шкода родных тут пакідаць?

Плача хмарка дождыкам —
не суняць,
А хто выйдзе весьніцы адчыняць,

Каб правесьці чыстую ў райскі сад,
Каб ёй не схацелася йсьці назад?

На пакуты шчодрая ёй была зямля...
Божа міласэрны наш, сустрэнь
Васіля.

Сачы за сабой

# IREX у «Павуціньні» КДБ

**22 чэрвеня па Беларускім тэлебачаньні паказалі дакумэнтальны фільм «Павуціньне», прысьвечаны «шкодніцкай» дзейнасьці ў нашай краіне прадстаўніцтва IREX. У КДБ кажуць, што гэта «папярэджаньне» амэрыканскай арганізацыі. Кіраўнік IREX называе высунутыя абвінавачаньні «абсалютным абсурдам».**



IREX-PROMEDIA

Боб Артэга ўпершыню патрапіў пад «інфармацыйную атаку» КДБ.

Фільм «Павуціньне» вытрыманы ў «найлепшых традыцыях жанру», распрацаванага Зімоўскім ды Азаронкам. Невядомыя аўтары стужкі малююць непрывабны вобраз амэрыканскай арганізацыі, якая, акрамя фінансавай падтрымкі незалежных СМІ, займаецца ў Беларусі ледзь не шпіянажам. Гледача палохаюць азначэньнем «інфармацыйнай вайны», узятым з вайсковага статуту ЗША. IREX быў абвінавачаны таксама ў падрыхтоўцы размяшчэньня ў Польшчы, Літве і Украіне сеткі радыёперадатчыкаў для вяшчаньня на Беларусь, а таксама ўласнай інфармацыйнай сеткі ў самой краіне.

Мы папрасілі дырэктара прадстаўніцтва IREX у Беларусі **Боба Артэгу** пракамэнтаваць фільм «Павуціньне». Ён назваў фільм «праграмай КДБ», многія факты ў якой, на яго думку, гучалі «абсалютна абсурдна». Артэга дзівіўся, адкуль у беларускіх уладных структурах столькі людзей, якія «нават не разумеюць самога сэнсу свабоднай прэсы», якой прадстаўніцтва дапамагае дасягнуць большага прафэсіяналізму і незалежнасьці.

«Некаторыя рэчы, якія мы пачулі ў гэтай праграме, гучалі абсалютна абсурдна, — гаворыць Артэга. — Напрыклад, тое, што мы трацім 600 тыс. даляраў на стварэньне сеткі радыёстанцый у памежных зь Беларусяй краінах. Альбо пра нелегальныя пастаўкі апаратуры. Гэта проста сьмешна». Паводле яго словаў, не адпавядаюць сапраўднасьці й зьвесткі пра стварэньне ўласнай інфармацыйнай сеткі ў краіне. Б.Артэга мяркуе, што, напэўна, маецца на ўвазе дапамога IREX рэгіянальным тэле- і радыёстанцыям, газэтам з мэтай паляпшэньня якасьці іх працы, але без умяшаньня ў зьмест навінаў і матэрыялаў, якія там зьяўляюцца. Глупствам назваў дырэктар прадстаўніцтва абвінавачаньне ў стварэньні фатасэрвісам IREX нэгатыўнага іміджу Беларусі. «У нашым архіве больш за 15 тысяч фатаздымкаў, і карыстальнікі могуць абраць любыя. Можна абраць здымкі Аляксандра Лукашэнкі, які сьмяецца, а можна — жабракоў на вуліцах Менску. Каму што патрэбна», — кажа Артэга.

Ён падкрэсьліў, што IREX «усё робіць абсалютна празрыста». А кожныя паўгоду Міністэрства замежных справаў атрымлівае ад яго справаздачу. Таму Артэга ня можа зразумець, чаму IREX, які ў іншых краінах працуе бесьперашкодна, у Беларусі сутыкаецца з такімі праблемамі.

IREX пакуль ніяк ня будзе рэагаваць на «інфармацыйную атаку» БТ. «Мы не плянуем скарачаць і згортваць нашыя праграмы», — сказаў ён. У той жа час Боб Артэга ня змог сказаць, колькі грошай ужо ўклала ў беларускія праекты ягоная арганізацыя. Дырэктар спаслаўся на тое, што працуе ў Менску са студзеня і яшчэ ўсяго ня ведае...

КДБ пацьвярджае свой удзел у стварэньні фільму «Павуціньне». Паводле словаў кіраўніка Цэнтру грамадзкіх сувязяў і інфармацыі Камітэту **Аляксандра Базанава**, супрацоўнікі дзяржбясьпекі ўдзельнічалі «ў фармаваньні ідэі», падчас падрыхтоўкі фільму былі ўлічаныя «аналітычныя ацэнкі КДБ». Сам Аляксандар Базанаў у фільме выступае з камэнтарамі.

КДБ вінаваціць IREX у «інфармацыйным ціску і прасоўваньні кіраванай інфармацыі». Дзейнасьць IREX, нібыта, пачала набываць «мэтанакіраваны палітычны характар». Але Камітэт, паводле словаў Базанава, «уважліва сачыў».

У той жа час «КДБ ня зьвязвае працу IREX наўпрост з варожай дзейнасьцю». Базанаў выказаў спадзяваньне, што ў бліжэйшы час дзейнасьць IREX у Беларусі будзе «прапарцыйна зьмененая ў адпаведнасьці з нашымі нацыянальнымі інтарэсамі». «Наша задача — выступіць публічна, адкрыта, прадставіць інфармацыю на суд грамадзкасьці», — кажа Базанаў. Паводле ягоных словаў, КДБ чакаў такой рэакцыі кіраўніка прадстаўніцтва на зьяўленьне фільму. Аднак Базанаў лічыць, што дакумэнты і факты, якія былі прадстаўлены ў фільме, цяжка аспрэчыць і яны сьведчаць пра «непразрыстасьць» пэўных дзеяньняў IREX у нашай краіне.

Праўда, дакумэнты, якія дэманстравалі ў фільме як «кампрамат», пераважна былі пазначаныя 2001 г. Атака ж на IREX была праведзеная толькі цяпер. Боб Артэга мяркуе, што гэта ня зьвязана з Актам аб дэмакратыі ў Беларусі, які разглядае Кангрэс ЗША.

**Сяргей Ёрш**

ДАВЕДКА «НН»:

IREX — International Research and Exchanges Board (Рада па міжнародных дасьледаваньнях і абмене) — амэрыканская арганізацыя, якая існуе з 1958 г., а ў Беларусі працуе з жніўня 1997-га. На пачатку сваёй дзейнасьці IREX атрымаў ад беларускіх уладаў шэраг падатковых ільготаў, у тым ліку і мытных. Асноўнымі задачамі прадстаўніцтва зьяўляюцца: правядзеньне сярод навукоўцаў адкрытых агульнанацыянальных конкурсаў на атрыманьне грантаў для навуковых дасьледаваньняў; стварэньне спрыяльных умоваў амэрыканскім навукоўцам для дасьледчай працы ў Беларусі; правядзеньне праграмаў прафпадрыхтоўкі і разьвіцьця, якія адпавядаюць станаўленьню дэмакратычнага грамадзтва ў новых эканамічных умовах. Праграмы IREX фінансуюцца грамадзкімі, дзяржаўнымі і прыватнымі фондамі.

ХРОНІКА ЎЦІСКУ

20 траўня сьвятар Гарадзенскага аб’яднаньня Саюзу хрысьціянаў веры эвангельскай Міхаіл Балык быў завочна асуджаны адміністрацыйнай камісіяй Маладачанскага гарвыканкаму за правядзеньне «цырымоніяў культу ў парушэньне ўсталяваных заканадаўствам правілаў» і пакараны штрафам на 26600 руб.

16 чэрвеня быў затрыманы на 15 ночаў прафэсар Юры Хадыка.

Тацяна Ялавая, затрыманая 18 чэрвеня проста ў школе за ўдзел у акцыі «Далоў тыранаў», у турме захварэла: пачалося запаленьне пераносься. Уначы 20 чэрвеня ў цяжкім стане яе перавезьлі ў больніцу №9, дзе дзяўчыне была зробленая апэрацыя. Пакуль Тацяна была ў клініцы, суд Цэнтральнага раёну, што раней даў ёй 10 сутак арышту, адмяніў сваю пастанову — цяпер Т.Ялавую чакае новы суд.

Сябры аршанскай суполкі КХП-БНФ Аўгіньня Казлова і Ўладзімер Карабанаў былі аштрафаваныя на 20 базавых адзінак «за неадпаведнасьць лёзунгаў заяўленай тэме пікету», які адбыўся яшчэ 11 студзеня. Міліцыі прыйшоўся недаспадобы лёзунг «Лукашызм зьнішчае Беларусь».

23 чэрвеня сябры віцебскай суполкі КХП-БНФ Уладзімер Плешчанка і Аляксандар Салаўян былі пакараныя грашовымі штрафамі па 150 базавых велічыняў кожны. Апазыцыянэры зьбіралі подпісы ў падтрымку ініцыятывы С.Папкова, які падаў у суд заяву пра незаконнасьць саюзнай дамовы.

24 чэрвеня падчас акцыі «Мы любім Ліцэй» на плошчы Якуба Коласа ў Менску былі затрыманыя Лявон Баршчэўскі, навучэнец Беларускага калегіюму Арцём Лява і карэспандэнт «НН» Зьміцер Дзядзенка. Іх завезьлі ў РУУС Савецкага раёну і, «устанавіўшы асобу», павыпускалі.

**АШ**

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

## Самы багаты мянчук

**471 606 500 рублёў гадавога прыбытку ў 2002 годзе задэкляраваў у падатковай інспэкцыі жыхар Менску.** Яго імя, з зразумелых прычынаў, не называецца.

## «Белтрансгаз» не аддаюць

**Беларускі бок адкладае продаж акцыяў «Белтрансгазу» расейскаму «Газпрому».** А.Лукашэнка ацаніў прадпрыемства ў 2,5—4 млрд даляраў. Расейцы — у мільярд. У адказ на такую нязгоду «Газпром» можа ўзьняць цану на газ для Беларусі ад унутрырасейскіх 25 даляраў за 1000 кубамэтраў да 42 даляраў. Але беларускі бок настойвае на рэальным кошце.

## Штраф замест кратаў

**А.Лукашэнка загадаў падрыхтаваць праект дэкрэту, згодна зь якім эканамічных злачынцаў (а ў гэтую катэгорыю трапляюць нават тыя, хто скраў курыцу або мех бульбы) ня будуць садзіць у турму.** Караць іх, згодна зь міжнароднай практыкай, будуць штрафам. У турмах пасвабаднее.

## Новая Гандлёвая

**ААТ «Стары Менск» возьмецца за адбудову Гандлёвай вуліцы ў Верхнім горадзе.** Канцэпцыя прадугледжвае «спалучэньне гісторыка-архіўных ды археалягічных росшукаў» з маркетынгавымі дасьледаваньнямі. Акцэнт зробяць усё ж на апошнія: на Гандлёвай паўстане цэнтар дзіцячага і сямейнага адпачынку з падземнай аўтастаянкай, катком, кінатэатрам, крамамі і г.д. Агульная плошча забудовы — 24830 м$^2$. Плянуецца і аднаўленьне сядзібы Ваньковічаў (Гандлёвая—Музычны завулак). Там разьмесьціцца галоўны офіс турагенцтва «АлатанТур». На пляцоўцы перад сядзібай будзе помнік Ваньковічу.

## Курыная вайна

**Расейскія вэтэрынарныя органы абмежавалі ўвоз курынага мяса і яек зь Беларусі.** Прычына — у прыватным сэктары Брагіншчыны выяўленыя выпадкі захворваньня хатняй птушкі на вірус Ньюкасла. Буйных птушкафабрык ён не закрануў, бо там праводзяць адпаведную вакцынацыю. Забарона, паводле незалежных экспэртаў, магла быць і адказам на беларускае абмежаваньне пастаўкі расейскага піва, хлеба, мукі й крупаў.

## «Алеся» пад сьледзтвам

**Супраць кіраўніцтва ААТ «Алеся» пачатая крымінальная справа паводле арт. 240 КК — «наўмыснае банкруцтва».** Як паведамілі супрацоўнікі Камітэту дзяржкантролю, кіраўнікі фірмы «наўмысна павялічвалі неплацежаздольнасьць прадпрыемства», вынікам чаго сталася страта 97,2 млн рублёў і далучэньне да латвійскае кампаніі.

## Крыза мадэльнага бізнэсу

**Фінал конкурсу «Міс Берасьце-2003» не адбудзецца.** Не хапае фіналістак. Замест 12 прыгажунь былі абраныя толькі восем. Арганізатары не захацелі набіраць патрэбную колькасьць за кошт «прасьцейшых» дзяўчат. Дый грошай на фінал не хапала. Цяпер асобнага конкурсу прыгажосьці ў Берасьці ня будзе. Прэтэндэнткі паедуць на менскія кастынгі.

## Залатая Алімпіяда

**XXVIII летняя Алімпіяда, што пройдзе ў Атэнах 13—29 жніўня 2004 г., будзе найдаражэйшай за ўсю гісторыю.** Кіраўнікам дэлегацыяў давядзецца жыць не ў гатэлях, якіх на ўсіх ня хопіць, а на караблях, дзе за кожнага чалавека давядзецца плаціць ад 536 да 718 эўра за суткі. Апроч таго, усе афіцыйныя асобы, акрамя прэзыдэнта, віцэ-прэзыдэнта і генсака НАК, мусяць купляць квіткі на спаборніцтвы.

## Бочак не стае

**Канцэрн «Белдзяржхарчпрам» здольны выпускаць у год 4,5 млн дэкалітраў хлебнага квасу. Але попыту няма.** Галоўная праблема тут — адсутнасьць бочак у гандлёвых прадпрыемстваў. Праз гэта колькасьць пунктаў распаўсюджваньня квасу скарацілася з 300 да 90.

**Паводле «Белапан», радыё «Свабода», «Gazety Wyborczej»**

# 4 ліпеня пятніца

## ● БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10, 18.15 «Агенцтва НЛС». Сэрыял.
9.15 Фільм—дзецям. «Казка пра цара Салтана».
10.40 «Казкі старога дуба». Мультфільм.
10.50 Сад мары.
11.20 «Лёгкія струны». Канцэрт інструмэнтальнага ансамблю Белтэлерадыёкампаніі.
10.45 Падарожжы дылетанта. «Галоўчыцы. Вотчына Горватаў».
12.15 Добры дзень, Беларусь!
13.10 Маст. фільм «Да пабачэньня, хлопчыкі».
14.35 «Песьні юнацтва нашых бацькоў». IX Рэспубліканскі фэстываль маладых выканаўцаў песень мінулых гадоў у Віцебску.
15.15 «Далікатны ўзрост». Сэрыял.
15.50 Маст. фільм «Іван Макаравіч».
17.15 «Псі-фактар». Сэрыял.
19.00 Камэдыя «Амэрыканская дачка».
20.45 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
22.50 Зона Х.
23.20 Драма «Казыно».

## ● СТВ

6.30 «Пауэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.55, 15.25 «Гаджэт і Гаджэціны». Мультсэрыял.
7.20, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.40 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.00 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.05, 18.20 «Менск і менчукі».
8.10, 23.00 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: мэлядрама «Ваенна-палявы раман».
9.55 «Турпаход».
10.05, 20.35 «Аўтапанарама».
10.20, 23.20 Праект «Адлюстраваньне»: «Цацкі». Дак. фільм.
11.05 «Тэатральныя гісторыі».
11.25 «Шалёны сьвет». Дак. фільм.
12.00 «Віно каханьня.
12.55 «Капітан Праўда». Сэрыял.
13.50, 18.35 «Канфэрэнцыя маньякаў». Тэлесэрыял.
14.45 Мультфільм.
15.00 «Чалавек-павук». Мультсэрыял.
16.15 Кіно: «Цені зьнікаюць апоўдні», 1-я сэрыя.
18.05 «Філярманічны тыдзень».
18.10 «Сьвецкая хроніка».
18.25 «Тэма дня».
20.10 «Рэактыўны бокс».
20.25 «Добры вечар, маленькі».
20.50 Кіно: камэдыя «Адзін цудоўны дзень».
23.10 «Навіны СНД».
0.05 Кіно: драма «Л-627».Францыя.

## ● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.45 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 «Ня толькі пра футбол».
10.10 Драма «Двое ў горадзе».
11.45 Сэрыял «Твінісы».
15.00 Маст. фільм «Шацунку Вам, спадарства!».
16.40 «Куміры».
17.05 Сэрыял «Лялька».
18.10 «Вялікае мыцьцё».
20.00 Час.
21.00 «Поле цудаў».
22.05 Маст. фільм «У пошуках прыгод».
0.00 «Ідалы».
0.25 Камэдыя «Рапсодыя Маямі».

## ● РТР

7.45 Сэрыял «Краявід з забойствам».
8.45 Сэрыял «Цені зьнікаюць апоўдні».
10.00, 19.00 Весткі.
17.50 «Аншляг».
18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
19.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
19.50 «Дабранач, дзеці!».
19.55 «Бэнэфіс Яфіма Шыфрына».
21.40 Камэдыя «Вустрыцы зь Лязаны».
23.20 Баявік «Раптоўны ўдар».

## ● Культура

15.05 «Рэнэсанс». Дак. фільм «Чыстае зьзяньне мінулага».
16.05 «Літаратурнае Перадзелкіна». «Я вартаўніком буду ў доме тваім». Фільм 4-ы.
16.30 «У сьвеце танцу». «Ядро разбуральніка». Балет у Амэрыцы.
17.30, 23.00 Навіны культуры.
17.50 «Расейская пяцёрка».
18.30 Дзёньнік фэстывалю «Зоркі Белых начэй».
19.00 «Эндзі Пэндзі». Мультсэрыял.
19.15 Маст. фільм «Горад Зэра».
20.55 «Лінія жыцьця».
21.50 Блеф-клюб.
22.25 «Перавал». Мультфільм для дарослых.
23.25 «Хто там...».

## ● НТВ

9.00 «Сёньня раніцай».
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Зусім сакрэтна. Шпіёны сутарэньняў».
10.15 «Без рэцэпту».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Хуткая дапамога-2».
17.25 «Каманда.ru».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў».
19.45 Сэрыял «Дальнабойнікі. Вераніка», 20-я сэрыя, заключная.
20.55 Залатая калекцыя. Дэтэктыў «Тугая пятля».
23.20 Супэрбокс. Заб Джуда супраць Джуніёра Вітэра.

## ● Эўраспорт

9.30 Гольф. Паўтор.
10.30 Прыгоды на прыродзе. Паўтор.
11.00 Пляжны валейбол. Нямеччына. Жанчыны. Фінал. Паўтор.
12.00 Футбол. Кубак Лібэртадорэс. Фінал. Паўтор.
14.00 Снукер. Кубак Эўропы. Мальта. Паўтор.
15.30 Бокс. Паўтор.
17.30 Футбол. УЭФА. Агляд сэзону. Паўтор.
18.30 Гонкі на матацыклах. Паўтор.
20.00 А потым яны сышлі. Часопіс.
21.00 Формула. Аўтаспартовы часопіс.
21.30 Супэргоначны ўік -энд. Часопіс.
22.30 Драйв-навіны.
22.45 Сумо. Басё.
0.00 Самы дужы чалавек. Часопіс. Паўтор.
2.00 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.

# 5 ліпеня субота

## ● БТ

7.00, 12.00, 15.00, Навіны.
7.15 «Крыс Каларада». Мультсэрыял.
7.40 5 цудаў.
7.50 «Не зявай!».
8.15 Існасьць. Духоўная праграма.
8.50 «Усё нармальна, мама!».
9.30 Экран індыйскага кіно. «На ростані». 1-я сэрыя.
11.05 Здароўе. Тэлечасопіс.
11.35 «Сьпявай, душа!». «Купальскія песьні».
12.15 Вясёлая сямейка.
12.45 Падарожжа дылетанта. «Легенды і тайны Крэўскага замку».
13.00 Сола для дэбютанта. Яўген Лятэ (труба).
13.10 Плянэта АРТ.
13.35 «Ёсьць толькі міг...».
14.05 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства» (Англія).
15.15 «Чысты дом — Беларусь». Відэафільм АТН.
15.35 Сэрыял «Джэк і бабовае дрэва» (ЗША). 1-я і 2-я сэрыі.
17.10 Трагікамэдыя «Не бядуй!».
18.35 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
19.20 Драма «Вялікі бізнэс».
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Канцэрт этна-трыё «Троіца».
22.30 Камэдыя «Натуральная бляндынка» (ЗША).

## ● СТВ

7.25 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
7.50 «Дыназаўры». Мультсэрыял.
8.15 «Кіно — дзецям»: музычная казка Л.Нячаева «Рыжы, сумленны, закаханы» («Беларусьфільм»). 1-я сэрыя.
9.40, 19.55 «СТВ-спорт».
9.50 «Рэактыўны бокс».
10.05 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
10.30 «Анфас». Вайскова-патрыятычная праграма.
10.45 «Разам».
11.15 «Партрэт у інтэр'еры».
11.30, 20.15 Кіно: маст. фільм «Д'Артаньян і тры мушкетэры». 3-я сэрыя.
12.45 «Рамонт».
13.05 Кіно: камэдыя «Агенты КДБ таксама кахаюць».
15.00 «Клюб «Белы папугай». Найлепшае.
16.00 «Вовачка-2». Сэрыял.
16.35 «Найлепшыя шоў сьвету з Урмасам Отам».
17.45 «Таямнічая кветка папараці». Дак. фільм.
18.00 Кіно: камэдыя «Жандар жэніцца».
19.30 «24 гадзіны».
21.35 Камэдыя «Хлапечнік». ЗША, 1984.
23.30 «Навіны СНД».
23.45 Кіно: мэлядрама «Цёплая вада пад Чырвоным мостам».

## ● АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20, 14.40 «Ералаш».
8.25 Грай, гармонік любы!
9.00 Слова пастыра.
9.15 Здароўе.
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Смак».
10.30 «Новы дзень». Ударная сіла. «Чорны прывід».
10.55 «Новы дзень». «Сканэр».
11.30 Сьмехапанарама.
12.10 «Падарожжы натураліста».
12.40 Тайны стагодзьдзя. «Дзеці Крамля».
13.20 «Срэбраны шар». Твары ХХ стагодзьдзя.
14.15 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
15.10 Баявік «Цёмны анёл». ЗША.
16.50 Камэдыя «Непапраўны лгун».
18.15 «КВК-2003». Прэм'ер-ліга.
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
20.55 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
21.55 Канцэрт Лаліты «Шоў разьведзенай жанчыны».
23.30 Трылер «Зона турбулентнасьці». ЗША.

## ● РТР

8.45 «Ранішняя пошта».
9.20 «Сто да аднаго».
10.15 «Сам сабе рэжысэр».
11.15 «У пошуках прыгод».
12.10 «Клюб сэнатараў».
13.00, 19.00 Весткі.
13.20 Камэдыя «Яна Вас кахае?!».
15.00 Маст. фільм «Дзікунка».
17.00 «Мая сям'я».
18.00 «Аншляг».
19.20 Прэм'ера. Маст. фільм «Поле бою» (ЗША).
21.45 Баявік «Вампір у Брукліне» (США).

## ● Культура

11.30 «Яўген Весьнік. Кур'ёзы, тэатар, кіно, жыцьцё». Перадача 1-я.
12.00 Дзіцячы сэанс. «Іншаземка».
13.10 «Гора — не бяда». Мультфільм.
13.20 «Прыстасаваны да жыцьця ў прыродзе». «Травяністыя раўніны».
13.50 «Партытуры не гараць».
14.15 «Знакамітыя арыі». Г.Даніцэці. «Кактэйль каханьня».
14.25 Зорныя гады «Ленфільму».
15.05 «Музычная гісторыя». Маст. фільм.
16.25 «Незвычайны Абразцоў». Дак. фільм.
17.05 Магія кіно.
17.30 «Казка казак». Мультфільм.
18.00 «Рамантыка рамансу».
18.40 «Сфэры».
19.25 «Пакой сьмеху». Тэлевэрсія спэктаклю.
20.30 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя».
21.00 Навіны культуры.
21.20 «Спадкаемцы». Маст. фільм.
22.50 «І даўжэй за век...».
23.30 В.А.Моцарт. Канцэрт для флейты з аркестрам.

## ● НТВ

9.05 «Кулінарны паядынак».
10.00 «Кватэрнае пытаньне».
10.50 Спорт. «Лято 6 з 49».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня».
11.15 «Востраў шчасьця». Прафэсія — рэпартэр.
11.45 «Служба выратаваньня».
12.15 Камэдыя «Калі спазьняюцца ў ЗАГС...».
14.05 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
16.05 Баявік «Манах».
18.05 «Найноўшая гісторыя. Змова ў манэжы».
18.50 Сэрыял у выхадныя. Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі. Спадчыньнік».
20.00 «Асабісты ўнёсак».
21.00 Мэлядрама «Дасье «Пэлікан».
23.50 «Усё адразу!».

## ● Эўраспорт

9.30 Гонкі на матацыклах. Паўтор.
11.00 Пляжны валейбол. Нарвэгія. Жанчыны. Паўфіналы.
13.00 Футбол. Кубак Лібэртадорэс. Фінал. Паўтор.
15.00 Пляжны валейбол. Нарвэгія. Мужчыны. Жывая трансьляцыя.
16.00, 20.30 Гонкі на матацыклах. 24 гадзіны Спа. Жывая трансьляцыя.
17.00 Формула 3000. Маны-Кур.
18.00 Вэляспорт. Тур дэ Франс. Жывая трансьляцыя.
21.00 К-1. Лас-Вэгас. Паўтор.
22.00 К-1. Лас-Вэгас.
23.30 Экстрэмальныя віды спорту.
0.45 Сумо. Басё.
2.00 Бокс. Гамбург.

# 6 ліпеня нядзеля

## ● БТ

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Крыс Каларада». Мультсэрыял.
7.40 5 цудаў.
7.50 Мультыклюб.
8.30 Арсэнал.
9.00 Альхімія слова.
9.05 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
9.35 Экран індыйскага кіно. «На ростані». 2-я сэрыя.
11.15 Сад мары.
11.40 Зоркі Канскага кінафэстывалю ў праграме «Новая калекцыя».
12.15 «Усё нармальна, мама!».
13.00 «Ваша лята».
13.40 Сьвятыні Беларусі. «Жыровіцкі цудадзейны абраз Маці Боскай».
14.05 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства».
15.15 Лёс чалавека.
15.40 Сэрыял «Барацьба за выжываньне».
16.35 Сэрыял «Джэк і бабовае дрэва» (ЗША). 3-я і 4-я, заключная, сэрыі.
18.05 Кліп-абойма.
18.45 Драма «Мяне завуць Арлекіна» («Беларусьфільм»). 1-я і 2-я сэрыі.
21.00 Панарама: падзеі тыдня.
21.55 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
22.15 Бокс. Баі наймацнейшых прафэсіяналаў сьвету. Трансьляцыя з ЗША.
23.05 Дэтэктыў «Пагроза».

## ● СТВ

7.25 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
7.50 «Дыназаўры». Мультсэрыял.
8.15 «Кіно — дзецям»: музычная казка Л.Нячаева «Рыжы, сумленны, закаханы» («Беларусьфільм»). 2-я сэрыя.
9.30 «СТВ-спорт».
9.45, 19.35 «Аўтапанарама».
10.05 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
10.30 «Менск і менчукі».
10.40 «Сьвецкая хроніка».
10.50 Арт-экспрэс. Культурнае жыцьцё сталіцы.
11.05 «Запрашаем паскардзіцца...».
11.15 «Філярманічны тыдзень».
11.20 «Плянэта людей».
11.35, 20.40 Кіно: фільм «Два капітаны», 1-я сэрыя.
12.45 «Добры дзень, доктар!».
13.05 Кіно: трылер «Пярсьцёнак з Амстэрдаму».
15.00 Кіно: камэдыя «Разява».
16.45 «Залатая дзясятка Беларускай опэры».
17.15 «Мэтафізыка Пецярбургу».
18.15 «168 гадзін».
19.05 «Пакуль гарыць сьвечка...».
19.55 «Асабісты інтэрас».
21.55 «Турпаход».
22.10 «Навіны СНД».
22.30 Кіно: драма «Я — Дзіна».

## ● АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Мультфільм.
8.30 Служу Айчыне!
8.55 Дыснэй-клюб: «Легенда пра Тарзана».
9.15 «У сьвеце жывёл».
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Падарожныя нататкі».
10.30 Пакуль усе дома.
11.10 Дог-шоў.
11.55 Вялікія бацькі.
12.20 «Клюб падарожнікаў».
13.00 Ералаш.
13.10 Разумніцы й разумнікі. Фінал.
14.15 Дыснэй-клюб: «Мышыны дом».
14.40 Ток-шоў «Выбар».
15.20 Камэдыя «Цацкі». ЗША.
17.20 Нядзельны «Ералаш».
17.45 Жывая прырода. «Тайны тысячы астравоў».
18.40 «Крывое люстра».
20.30 Контуры.
21.10 Баявік «Угнаць за 60 сэкунд». ЗША.
23.20 Часы.

## ● РТР

9.15 «Гарадок». Дайджэст.
9.45 Парад камэдый. «Прывід з шафёрам».
11.15 «Вакол сьвету».
12.05 «Дыялёгі пра жывёл».
13.00 Весткі.
13.20 «Сьвет на мяжы».
13.50 «Пакой сьмеху».
14.55 Чэмпіянат сьвету па аўтагонках у клясе «Формула-1». Гран-пры Францыі. Жывая трансьляцыя з аўтадрому Ман'і-Кур.
17.00 Прэм'ера. Камэдыя «Косткі і сабакі» (ЗША). 2000 г.
19.00 Весткі тыдня.
20.10 Сусьветнае кіно. «Тэрмінатар-2. Судны дзень» (ЗША).
22.50 Прэм'ера. Баявік «Формула-51» (ЗША).

## ● Культура

11.35 «Яўген Весьнік. Кур'ёзы, тэатар, кіно, жыцьцё». Перадача 2-я.
12.00 «Рыцары сьмеху». «Рамантычная камэдыя».
12.30 Дзіцячы сэанс. «Зачараваны хлопчык». Мультфільм.
13.20 «Прыстасаваны да жыцьця ў прыродзе». «Узьбярэжжа».
13.50 Ізноў пласьцінка пяе.
14.15 «Дэшыфроўнікі». Дак. фільм (ЗША, 1994).
15.15 «Шэдэўры сусьветнага музычнага тэатру». А.Даргамыжскі. Опэра «Каменны госьць».
16.45 «Астравы».
17.25 Сьмеханастальгія.
17.50 «Каліф-бусел». Мультфільм.
18.10 Вечары ў тэатры «Школа сучаснай п'есы».
18.55 «Сустрэчны». Маст. фільм.
20.15 «Былое ў тварах». «Пахвала авантурыму».
20.55 «Замкі жахаў». Дак. сэрыял.
21.25 «Культ кіно». «Пасьля жыцьця». Маст. фільм.
23.25 Джэм-5.

## ● НТВ

9.20 Сэрыял у нядзелю. «Каханьне ўдаўца».
10.15 «Расьліннае жыцьцё».
10.50 Граем у «Кено».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня».
11.15 «Уплыў».
12.00 Дэтэктыў «Рынг».
13.50 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
15.55 «Вы будзеце сьмяяцца!».
16.05 «Гісторыі паляўнічага на кракадзілаў. Плот ад дынга».
16.40 Камэдыя «Радавы Бэнджамін» (ЗША).
18.50 Сэрыял у выхадныя. Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі. Мэдуза Гаргона».
20.00 «Надоечы». Найлепшыя рэпартажы».
21.30 Фільм тыдня. Мэлядрама «Танец-бліскавіца».

## ● Эўраспорт

3.30 Аўтагонкі сэрыі КАРТ. Кліўленд. Жывая трансьляцыя.
9.30, 13.00, 15.45 Гонкі на матацыклах. 24 гадзіны Спа. Жывая трансьляцыя.
11.00 Пляжны валейбол. Нарвэгія. Жанчыны. Фінал.
12.00 Пляжны валейбол. Нарвэгія. Мужчыны. Паўфінал. Жывая трансьляцыя.
13.30 Матакрос. Чэмпіянат сьвету. Швэцыя. Жывая трансьляцыя.
14.30, 16.00 Вэляспорт. Тур дэ Франс. Жывая трансьляцыя.
18.45 Пляжны валейбол. Нарвэгія. Мужчыны. Фінал.
19.45, 21.00 Бокс. Паўтор.
22.00 Сумо. Басё.
23.00 Вэляспорт. Тур дэ Франс. Агляд.
0.15 Аўтагонкі. Амэрыкан Ле Ман.
0.15 Аўтагонкі сэрыі Інды Рэйсынг Ліг.


# Падпіска

Незалежная «Наша Ніва» — гэта Ваша газэта, якая выходзіць толькі на Вашы грошы. Кошт падпіскі не павялічыўся. Гэта 2043 рублі на месяц звыклым чынам і 1360 рублёў пры падпісцы на шапік «Белсаюздруку» для менчукоў.

Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. Падпісны індэкс **63125**.

## Дык падпісвайся!



# Сабачы падатак



IREX-PROMEDIA

**У Горках райсавет ня толькі ўвёў штомесячны падатак за ўтрыманьне сабак, але і абавязаў іх уладальнікаў сплачваць камунальныя паслугі за сваіх жукоў ды мурзаў.**

«Сабачыя гісторыі» пачаліся мінулым летам, калі мясцовае прадпрыемства «Камунальнік» пачало маштабны адстрэл бадзяжных сабак, бо ў горадзе пачасьціліся выпадкі шаленства. Жывёлаў стралялі наўпрост на вуліцах, і ў самую сьпёку забітыя яшчэ некалькі дзён валяліся па дварах. Мала таго што адстрэл адбываўся часьцяком на вачах дзяцей, дык яшчэ й сярод сабак трапляліся зусім не беспрытульныя, а нават тыя, гаспадары якіх гулялі недалёка і проста не пасьпявалі выратаваць сваіх улюбёнцаў.

Адстрэл спыніўся пасьля шматлікіх скаргаў. Аднак у райсавет ад камунальнікаў адразу ж паступіла рэкамэндацыя ўвесьці дадатковы збор з гаспадароў сабак. Народныя абраньнікі, разглядаючы чарговы бюджэт раёну, зацьвердзілі і «сабачы падатак».

Зьбіраецца ён у залежнасьці ад памеру жывёлы. Так, за сабаку ад 40 см вышынёю трэба штомесяц уносіць 10% базавае велічыні. Калі рост вашага сабачкі паміж 40 і 70 см, мусіце плаціць ужо 15%. Ну, а калі ваш гадаванец вымахаў болей за 70 см ці проста належыць да «патэнцыйна небясьпечных пародаў», ягонае ўтрыманьне абыдзецца вам у 20% базавае велічыні. Сама рэгістрацыя каштуе 10%. У выніку такой арытмэтыкі, як пазначана ў прыбытковай частцы раённага бюджэту, горад атрымае невялікую, але дужа патрэбную суму — 900 тыс. рублёў.

Акрамя падатку жыхары шматпавярховак і прыватных дамоў абавязаныя аплачваць камунальныя паслугі за сваіх пітомцаў — штомесяц уносіць плату за газ, ваду і ацяпленьне. Права бясплатна ўтрымліваць сабаку маюць інваліды, для якіх сабака-павадыр — жыцьцёвая неабходнасьць, і беспрацоўныя адзінокія пэнсіянэры. Грошы з «сабачага падатку» мусяць ісьці на абсталяваньне пляцовак для выгулу сабак, а таксама на гадавальнік, у якім адлоўленыя камунальнікамі жывёлы будуць утрымлівацца пяць дзён, пакуль іх ня знойдуць гаспадары.

У Горках, калі ўлічваць толькі зьвесткі па прышчэпленых летась ад шаленства, болей за 1000 гаспадарскіх сабакаў. Іх уладальнікі ня хочуць несьці дадатковыя выдаткі. Многія праўдзіва кажуць, што ў горадзе й так дастаткова месцаў для выгулу, таму няма чаго зьбіраць грошы на нейкія спэцыяльныя пляцоўкі. Дый хто можа гарантаваць, што грошы пойдуць менавіта на вырашэньне гэтых праблемаў? Незразумела таксама, у якіх умовах будуць утрымлівацца сабакі ў тым гадавальніку і што з жывёламі будзе, калі гаспадар ня знойдзецца за пяць дзён?

Найбольш абураюцца гаспадары прыватных дамоў, чые сабакі заўжды на ланцугах і нідзе не гуляюць. Дый ежу для жывёлаў там гатуюць на дарагім балёне газу, што набываецца на ўсю сям'ю. Як у такім разе можна яшчэ дадаткова патрабаваць аплаты камунальных паслугаў за сабаку? «Нам улады ўвогуле павінны сказаць «дзякуй»: калі б сабакі не вартавалі нашых хат, міліцыя стамілася б разьбіраць заявы па крадзяжах», — кажа адзін гаспадар.

Праз такі супраціў плян завяршыць рэгістрацыю сабак да 20 траўня і пачаць зьбіраць падатак пасьпяхова праваліўся. Сёньня толькі лічаныя гаспадары «легалізавалі» сваіх жывёлін. Кіраўніцтва ЖЭСу вырашыла зладзіць абыход кватэраў. Аднак ужо першыя жыхары сустрэлі камунальнікаў «вэрбальнай атакай». «Гэта яшчэ нічога, — кажа адзін з удзельнікаў абыходу, — вось калі пачнём абыходзіць прыватныя дамы, там мы не такога яшчэ наслухаемся».

Частка жыхароў гораду падтрымлівае рашэньне райсавету: шмат каму надакучылі «непрыемныя рэчы», якія сабакі часьцяком пакідаюць у пад'ездах ды на лесьвічных пляцоўках. Да таго ж ніхто ня хоча, каб сабакі кусалі ці пужалі на вуліцах дзетак. З гэтага гледзішча стварэньне гадавальніку і збор грошай з «сабакаводаў» выглядае натуральным. А рэгістраваць сабак папросту неабходна — тады прасьцей двойчы на год прышчэпліваць іх ад шаленства.

Падобныя зборы існуюць у Магілёве ды Бабруйску. Там камунальную плату за сабак уносяць толькі гаспадары, што жывуць у кватэрах камунальнай уласнасьці, астатнія сплачваюць адно падатак. У Горках улады крыху перастараліся, аднак выпраўляцца пакуль не зьбіраюцца. Калі абыход кватэраў ня дасьць плёну, будуць ладзіць сходы жыхароў з абавязковай яўкай. Дзе і зарэгіструюць сабачак.

**Ільля Заранок, Горкі**

## «Самапал» у выканкаме

**Былы жыхар Баку (Азэрбайджан) разам з жонкай у чарговы раз завітаў у Рэчыцкі райвыканкам.** Ён ужо больш за дзесяць гадоў хоча атрымаць статус уцекача ў Беларусі, але беспасьпяхова. (У Рэчыцу яны пераехалі да далёкіх сваякоў жонкі.) Каб атрымаць гэты статус, мясцовыя ўлады патрабуюць пашпарт СССР, але яго адабралі яшчэ ў Азэрбайджане ў 1992 г., калі яны з жонкай уцякалі ад пагромаў у Баку.

Ужо ні на што не спадзеючыся, чалавек, даведзены да адчаю, выліў на канапу й на сябе бутэльку распушчальніку ды зрабіў спробу падпаліць сябе, але супрацоўнікі выканкаму гэтаму зашкодзілі. Тады, лаючыся на ўлады, ён прыгразіў, што забʼе сябе нажом, але й гэта не атрымалася. Нарад міліцыі адвёз уцекача ў пастарунак.

## Дзень народзінаў касьцёлу

**У Рэчыцкім касьцёле Сьвятой Тройцы адбыліся сьвяткаваньні з нагоды 100-годзьдзя яго будаўніцтва й асьвячэньня.** У суботу 14 чэрвеня, падчас асноўных мерапрыемстваў, касьцёл ледзьве ўмесьціў усіх ахвотных. На сьвята прыехалі госьці з суседніх прыходаў разам з ксяндзамі: з Гомелю, Мазыра, Шацілак. Былі таксама сваякі й сябры рэчыцкага ксяндза Рыгора Худака з Польшчы. Кветкі для аздабленьня былі прывезеныя аж зь Пецярбургу. Сьвяточнае богаслужэньне вёў біскуп Казімер Вялікаселец.

Перад службай і пасьля адбыліся канцэрты з удзелам бабруйскага «Magnificat'у», хору «Канцона» й навучэнцаў мясцовай музычнай школы. На сьвяткаваньні акрамя гасьцей і вернікаў прысутнічалі былы старшыня Рэчыцкага гарсавету М.Зайцаў і былы старшыня гарвыканкаму М.Заразака, дзякуючы якім 22 верасьня 1999 г. касьцёл быў перададзены вернікам. Цяперашнія раённыя кіраўнікі запрашэньні праігнаравалі.

**Валеры Пуціцкі, Рэчыца**

## А ў нас у Берасьці...

**Апошнім часам на цэнтральных вуліцах відаць быў вялікі рух.** Чакалі прыезду «самічедаецекага». Дарожныя будаўнікі і рамонтнікі працавалі амаль без выходных — рамантавалі дарожнае пакрыцьцё, клалі брук і г.д. А паколькі прафсаюзаў годных у краіне амаль няма, дык і працуюць простыя працоўныя і іх кіраўнікі нават у непрацоўны час.

А берасьцейскі выканкам у чарговы раз прадэманстраваў клопат пра пасажыраў прыватных маршрутных таксовак. Толькі нядаўна ляпілі налепкі «шашкі», «таксі-Берасьце» і выяву «берасьцейскага гербу», а тут ужо патрэбна, каб былі налепкі «экспрэс» і літара «Э» каля нумару маршруту.

Так бы мовіць: «Э, таварыш, вас тут не стаяла!» Як гэта ўсё палепшыць абслугоўваньне простых грамадзянаў, невядома. Але, як казалі ў старадаўнім Рыме, «шукай, хто мае з гэтага выгаду!»

Ехаў пару дзён таму ў тралейбусе і ўбачыў «цудоўны» плякат на бульвары імя Шаўчэнкі: «Жыхары Берасьця — вы ў адказе за чысьціню і парадак на вуліцах гораду!». Амаль: «Піянэр — ты ў адказе за ўсё». Пэрлы для новых сатырыкаў.

**Берасьцейскі спажывец**

## Фэрмэр садзіць сады

**Больш за сто яблыняў пасадзілі сёлета ў Дайлідзкай сярэдняй школе Астравецкага раёну.** Набыць саджанцы, распрацаваць праект саду для школы ды ажыцьцявіць яго дапамог фэрмэр Часлаў Лабачэўскі. У яго сёлета засталося багата непрададзеных саджанцаў, вось ён і вырашыў зладзіць такую дабрачынную акцыю. Фэрмэр таксама заклаў сады ў Гудагайскай, Альхоўскай і Кямелішскай школах.

**Мар'ян Вянгроўскі, Астравец**

## Хаты для зьмеяў

**У вёсках Мядзельшчыны большае пакінутых хат.** Моладзь паўцякала ад калгасу ў гарады, а старыя — пакаленьне, што расло пры Польшчы, — паціху адыходзяць. Крыху людней там, куды пасялілі перасяленцаў з чарнобыльскае зоны, якія па першым часе дзівілі тутэйшае вуха нязвыклым «ста́рый» ды «шахвёр». За нейкі дзясятак гадоў, што яны жывуць тут, ніяк не засвоіш сотні й тысячы мясцовых тапонімаў — назваў урочышчаў, рачулак, астравоў. Тыя назовы могуць пазьнікаць разам з прыродным тутэйшым людам, якога ўсё меней. У Слабадзе (афіцыйна — Новікі) пустых хат ужо чатырнаццаць, у Няверах (тых, што бліжэй да Мядзелу) усяго зь дзясятак насельнікаў. У Старынках, Кашонаўцы, Магдуліне і таго няма. Дык расказвалі, што ў спусьцелыя будынкі йдуць зь лесу зьмеі. А што ж — суха, зацішна і мышэй хапае.

Цікава, што ў Мядзеле, а асабліва на Замку — востраве, аточаным балотам ды возерам, — ніколі ня бачылі ніводнае гадзюкі. Баялі, што даўна там была нейкая каралеўна-чараўніца, якая замовіла места ад зьмеяў. Няпраўда, канечне, але іх сапраўды няма.

Калгасы безь людзей слабеюць, ня могуць даць рады зямлі. Дзе далей ад дарогі, па якой езьдзіць начальства, ляжаць аблогай некалі асушаныя тарфянікі. Расьце бадыльлё. Наваt удзень пераляталюць дарогу зайцы; на слупах сядзяць каршуны, пільнуюць здабычу. Распладзілася дзікоў, дзікіх козаў. Патроху зарастаюць лазой мэліярацыйныя каналы. І ўсяе карысьці з таго асушэньня.

**Васіль Дубяга, Мядзел**

## Šeście ŭ honar Chrysta

**U niadzielu, 22 červienia, ŭ Baranavičach adbyłosia šeście ŭ honar Božaha cieła i kryvi.** Niekalki tysiač čałaviek (na zdymku źleva) z malitvaj i śpievami prajšli ad kaściołu Ŭźvižańnia Śviatoha Kryža da chramu Maci Božaj Facimskaj. Padčas šeścia dzieci pasypali darohu pialostkami ružaŭ. Ludzi zapynialisia j malilisia — kala impravizavanych kapličak la Domu aficeraŭ, handlovaha centru «Viasiołka» (darečy, niekali tutaka stajaŭ pomnik Stalinu) i liceju.

Kala kaściołu Maci Božaj Facimskaj kalona viernikaŭ sustrełasia ź pilihrymami ŭ Budsłaŭ, jakija vyjšli ź Bieraścia bolš za tydzień tamu. U paniadziełak pašla adpačynku pilihrymka rušyła dalej. U nas da jaje dałučylisia bolej za sto čałaviek.

**Rusłan Raviaka, Baranavičy**



FOTA A.JANA HLINKI

# Канстытуцыя канфэдэрацыі

**Краіны Эўразьвязу прынялі за аснову праект эўрапейскай канстытуцыі, распрацаваны Канстытуцыйным канвэнтам. Аднак шлях да ўвасабленьня праекту ў жыцьцё абяцае быць нялёгкім.**


Валеры Жыскар д'Эстэн прэзэнтуе чарнавік Канстытуцыі Эўропы грэцкаму прэм'еру Костасу Сімітысу.
AP

Хоць тыдзень таму лілося шампанскае, гучаў эўрагімн, а прамоўцы падкрэсьлівалі, што пятніца, трынаццатага выявілася шчаслівай і ўвойдзе ў гісторыю, Канвэнт працы так і ня скончыў. Засталіся няўзгодненымі трэці (асновы супольнай палітыкі ЭЗ і прынцыпы заканатворчасьці) і чацьверты (спосаб прыняцьця канстытуцыі) разьдзелы.

Старшыня Канвэнту, француз Валеры Жыскар д'Эстэн заклікаў да мінімальных зьменаў у праекце, які стаўся вынікам насілу выпрацаванага кампрамісу. Аднак міністар замежных справаў Гішпаніі Ана Паляцыё сказала, што ў Мадрыду ёсьць сур'ёзныя прэтэнзіі наконт падзелу ўлады ў Эўразьвязе пасьля 2009 г. (ад таго часу рашэньні будуць лічыцца прынятымі, калі іх падтрымае палова краін Зьвязу з насельніцтвам больш за 60% ад агульнай колькасьці).

Брытанец Пэтэр Хейн заявіў аб неабходнасьці папраўкі да артыкулаў пра замежную палітыку і крымінальнае права, а француз Дамінік дэ Вільпэн — пра інтарэсы сваёй краіны ў галіне земляробства і захаваньня культурнай адметнасьці. Толькі немец Ёшка Фішэр быў задаволены посьпехам. Бэрлін выходзіць з дыскусіі пераможцам — з прычыны найбольшай колькасьці насельніцтва (82 млн чалавек). Немцы будуць граць у Зьвязе першую скрыпку, тады як малыя краіны трацяць уплыў. З 2009 г. кожная краіна будзе мець свайго камісара ў Брусэлі, але права голасу будзе толькі ў пятнаццаці зь іх. Прадстаўнікі як Нямеччыны, так і Мальты будуць захоўваць паўнамоцтвы аднолькавы тэрмін.

«Пэрыфэрыйны» саюз Гішпаніі, Вялікабрытаніі, Даніі і Польшчы, які вымаляваўся падчас вайны ў Іраку, страціць магчымасьць блякаваць рашэньні. Але такую мажлівасьць набудуць Францыя і Нямеччына, калі пераканаюць у сваёй пазыцыі Італію — што ня выключана, беручы пад увагу хуткія выбары ў Рыме.

Калі 25 урадаў зацьвердзяць Канстытуцыю, яна будзе падпісаная ў першых днях траўня 2004 г. Потым яе трэба будзе ратыфікаваць. Многія краіны запатрабавалі рэфэрэндуму, у тым ліку вядомая сваім эўраскептыцызмам Данія. Ці набудзе канстытуцыя моц 1 студзеня 2006 г. — можна толькі гадаць.

Многія хацелі б яшчэ сёе-тое зьмяніць у прынятым праекце. Польшчу хвалююць пункты, якія датычаць абароннай палітыкі Зьвязу: яна б хацела, каб эўрапейскія ўзброеныя сілы былі памочнікам, а не канкурэнтам для NATO. Гішпанія хоча выторгаваць для сябе больш дэпутацкіх месцаў у Эўрапарлямэнце.

Арганізатары хочуць скончыць абмеркаваньне ўжо сёлета, каб некалькі неабходных месяцаў засталося для юрыстаў і перакладчыкаў: на ўсіх дваццаці зь лішкам мовах ЭЗ Канстытуцыя павінна гучаць аднолькава. Тады яе можна будзе падпісаць у пачатку траўня 2004 г. — адразу пасьля ўступленьня новых краін у ЭЗ і перад чэрвеньскімі выбарамі ў Эўрапарлямэнт.

**СП**

Умбэрта Эка

# Эўропа: супэрдзяржава або нішто


Робэрт Бірнбаўм

Цяжка ўявіць сабе менш прыдатны момант для прагназаваньня будучыні Старога Сьвету, чым цяпер. Процілеглыя пазыцыі ў справе ірацкае вайны агалілі супярэчнасьці між эўрапейскімі краінамі, а ўваход у Зьвяз новых дзяржаў вымушае ядначца як старыя дэмакратыі — якія гатовы часткова абмежаваць уласны сувэрэнітэт, — так і дэмакратыі маладыя, гатовыя бараніць толькі што здабытыя формы дзяржаўнага ладу нават з дапамогай хаўрусьнікаў за межамі Эўропы. Гэткаму разьвіцьцю падзеяў спрыяюць ня толькі эўрапейская сьвядомасьць і тоеснасьць, але і абставіны, якія могуць гэтую еднасьць аслабіць.

…Мы ўсё мацней адчуваем эўрапейскую тоеснасьць. Можа, яна ня кідаецца ў вочы, калі мы, эўрапейцы, наведваем іншыя эўрапейскія краіны — тады мы схільныя заўважаць хутчэй адрозьненьні (але ж адрозьненьні фіксуе і міланец у Палерма ці калябрыец у Турыне). Гэтая тоеснасьць, аднак, адразу ажывае, калі мы кантактуем зь людзьмі неэўрапейскае культуры, у тым ліку амэрыканцамі. Падчас кангрэсаў, сяброўскіх сустрэчаў, нават падчас турыстычнай вандроўкі здараецца момант, калі мы адчуваем раптоўную еднасьць. Француза, гішпанца ці немца — іх пункт гледжаньня, падзіны і густы — мы разумеем лепш, чым прадстаўнікоў іншых кантынэнтаў. Летась у сьнежні, адкрываючы ў Парыжы канфэрэнцыю прыхільнікаў міру, філёзаф і міністар Люк Фэры заўважыў (ня дужа арыгінальна, затое вельмі ўзьнёсла), што сёньняшні француз нават уявіць ня можа вайны зь Нямеччынай (як англічанін не ўявіў бы вайны з Італіяй, а гішпанец — паходу на Фляндрыю), хоць на працягу дзьвюх тысяч гадоў такія канфлікты і міждзяржаўныя адносіны лічыліся цалкам нармальнымі.

Застаецца безьліч прычын, зь якіх француз яшчэ можа адчуваць розьніцу паміж сабой і немцам, але абодвух сёньня яднае працяглы супольны досьвед, які закрануў і асабіста іх, і іх народы. Так, нам уласьцівае супольнае разуменьне дабрабыту, здабытае не праз гамэастаз «этыкі посьпеху», а праз прафсаюзную барацьбу. Усе мы зьведалі заняпад капіталізму і разбурэньне імпэрый; усе перажылі дыктатуры, адчулі іх на сваёй скуры, навучыліся пазнаваць іх праявы і выпрацавалі супраць іх (прынамсі збольшага) імунітэт. Усе мы зьведалі, што такое вайна ва ўласным доме і якой жудаснай яна бывае. Таму, асьмелюся сьцьвярджаць, калі б самалёты таранілі Нотр-Дам дэ Пары ці Біг Бэн, рэакцыя напэўна складалася б з болю і абурэньня, але была б пазбаўленая немага зьдзіўленьня і ўсіх гэтых хістаньняў між дэпрэсіяй і інстынктыўным жаданьнем адплаціць любой цаной, якія агарнулі амэрыканцаў, упершыню ў гісторыі атакаваных на ўласнай зямлі.

Эўрапейцаў лучыць многае: радасьці і пакуты, гонар і сорам, традыцыі, якія варта абараняць, і згрызоты сумленьня, зь якіх трэба рабіць высновы. Ці дастаткова ўсяго гэтага, каб стварыць сапраўды адзіную Эўропу? Хутчэй не. Нягледзячы на існаваньне эўра і пашырэньне супольнасьці за кошт новых краінаў, мы штодня бачым сьведчаньні тае негатовасьці. Дзеля далучэньня да Зьвязу тыя краіны могуць адрачыся ад многага, але не ад усяго. Яны не заўсёды гатовыя праявіць салідарнасьць (пра што засьведчыла рознасьць у стаўленьні да ірацкай вайны).

Неаспрэчна, што Эўропе, якая ўсё ніяк не можа здабыць еднасьці, папросту наканаваная еднасьць. Падчас «халоднай вайны» Эўропа, скалечаная другой сусьветнай вайной (і падзеленая на ўсход ды захад), была вымушаная жыць пад апекай іншых калосаў — Злучаных Штатаў і Савецкага Саюзу…

Карціна пачала зьмяняцца ўжо пасьля разбурэньня Бэрлінскай сьцяны, але істотныя зрухі адбыліся толькі ў апошнія гады — можа, з той пары, як Амэрыка абыякава паставілася да балканскай праблемы. Пасьля перамогі ў пяцідзесяцігадовым процістаяньні з СССР Штаты зразумелі, што маюць новага ворага, які не канцэнтруецца ў адным месцы, а расьцярушаны па ўсім мусульманскім сьвеце, на Блізкім і Далёкім Усходзе, — і супраць яго скіравалі сваю вайсковую моц, ад Кабулу да Багдаду, а можа, і далей.

Тым часам робіцца відавочным, што праціўнікам у вялікай канфрантацыі, да якой рыхтуюцца Злучаныя Штаты, мае быць Кітай. Няма прыкметаў таго, што гэта будзе ўзброеная канфрантацыя, але без сутычкі на эканамічным і дэмаграфічным узроўні напэўна не абыдзецца. Дастаткова наведаць любы амэрыканскі ўнівэрсытэт, каб пераканацца, што стыпэндыі, навуковыя пасады і кіраваньне студэнцкімі арганізацыямі ўсё часьцей дастаюцца студэнтам-азіятам. Амэрыканскі навуковы прагрэс чым далей, тым мацней будзе залежаць ад інтэлектуальных рэсурсаў ня столькі з Эўропы, колькі з Азіі — ад Індыі і Кітаю да Японіі. Гэта азначае, што ўся ўвага амэрыканцаў з Атлянтычнага рэгіёну пяройдзе на Ціхаакіянскі, — зрэшты, ужо даўно вялікія прамысловыя і дасьледчыя цэнтры будуюцца на ўзьбярэжжы Каліфорніі ці перамяшчаюцца туды.

Пакінутая сам-насам Эўропа зробіцца эўрапейскай ці распадзецца. Вэрсія распаду падаецца далёкай ад рэальнасьці, але і яе варта мець на ўвазе: Эўропа балканізуецца або лацінізуецца. Новыя супэрдзяржавы (у далёкай будучыні месца ЗША тут можа заняць Кітай) згодна з уласнымі інтарэсамі будуць разыгрываць свае партыі з малымі эўрапейскімі краінамі, у залежнасьці ад таго, дзе ім выгадней мець базы: у Польшчы ці на Гібралтары, у Хельсынкі ці, можа, у Таліне. А чым мацней Эўропа будзе падзеленая, чым менш канкурэнтаздольным на сусьветных рынках будзе эўра, тым лепей для супэрдзяржаваў. Гэтага не адбудзецца хіба тады, калі Эўропе хопіць энэргіі заявіць аб сабе як Трэцім Полюсе, поруч з ЗША і Ўсходам (пабачым, зробіцца Ўсходам Пэкін ці — хто ведае — Токіё або Сынгапур).

Калі Эўропа хоча зрабіцца Трэцім Полюсам, у яе толькі адзін шлях. Сьледам за дасягненьнем эканамічнай і грашовай еднасьці яна мусіць займець адзіную і незалежную замежную палітыку, а таксама ўласную сыстэму абароны.

Ці здолеюць эўрапейскія ўрады прыйсьці да такога адзінства? Габэрмас у сваім закліку (ён нядаўна апублікаваў у «FAZ» і «Liberation» артыкул «Наша абнаўленьне. Пасьля вайны. Адраджэньне Эўропы». — **Рэд.**) маркуе, што немажліва дасягнуць гэтай мэты адразу, у пашыранай Эўропе, якая ахопіць Эстонію і Турцыю, Польшчу і, магчыма, у будучыні Расею. Але гэты праект мог бы зацікавіць групу краін, дзякуючы якім нарадзіўся Эўразьвяз. Калі б гэтая група паказала прыклад, іншыя краіны (хто ведае?) з часам маглі б далучыцца.

Ці ня ўтопія гэта? Так, утопія, але з тых, што — як падказвае здаровы сэнс — павінны стаць рэальнасьцю, зважаючы на новы расклад сілаў на плянэце. Яна — альбо нішто. У адваротным выпадку Эўропа ператворыцца, без абразы для некага, у Гватэмалу. Такі сэнс закліку, зь якім некалькі грамадзянаў Эўропы зьвяртаюцца да ўрадаў кантынэнту, на якім нарадзіліся і на якім хочуць жыць далей, адчуваючы гонар за сваю эўрапейскасьць.

# Цывілізацыя Беларусь

Я Беларусь ня надта люблю. Яна можа быць прывабнай, калі яе параўноўваць зь некаторымі краінамі трэцяга сьвету, што часта і робіцца. Калі ж яе судзіць па «гамбурскім ліку», яна недастаткова прыгожая, недастаткова ўтульная і недастаткова цікавая. У цікавых грамадзтвах пахне вялікімі амбіцыямі, вялікімі справамі, вялікімі грашыма і вялікімі страсьцямі. У нашым пахне будзённасьцю, запаволенасьцю ды казённым домам. Большасьць маіх дарагіх суайчыньнікаў вяршаць справы так, быццам у іх яшчэ два-тры жыцьці назапашана, затое п'юць так, быццам заўтра не існуе.

Я ня маю намеру ганьбіць беларусаў — я сам адзін зь іх і маю поўнае права на самакрытыку. Я проста хачу перастаць ставіцца да сваёй радзімы як да хранічна хворага дзіцяці, якое апрыёрна ня ў стане канкураваць з «моцнымі сьвету». Мне недаспадобы, калі спасылаюцца на цяжкі лёс беларусаў, быццам бы гісторыя іншых народаў складаецца з адных сьвятаў. Мне сьмешна, калі нас, народ «васільковай» ды «сінявокай» жабрацкай краіны, называюць разумным, добрым, працавітым ды талерантным. Калі мы разумныя, то чаму так па-дурному жывём? Калі добрыя — то чаму крычым на дзяцей і гарой стаім за сьмяротнае пакараньне? Калі працавітыя, то чаму такія бедныя? А няздольнасьць да пратэсту, прабачце, яшчэ не вызначае талерантнасьці. Можа, лепей проста спакойна і цьвяроза ўглядзецца ў сябе, зрабіць гэты першы крок да сапраўднай самапавагі. Бо крыўда на праўду — гэта толькі ад слабасьці.

Бяда ня ў тым, што заваявалі нашу тэрыторыю, а ў тым, што заваявалі наш дух. Мы лічым зусім натуральным, што нехта ў сьвеце жыве лепей за нас. Няма сэнсу плакацца на тое, што ў гісторыі не пашанцавала, калі сёньня можна рабіць гісторыю ўласнымі рукамі.

І спрабуем рабіць. Я маю на ўвазе тую валтузьню паміж афіцыйнай уладай і апазыцыяй. Пра першых казаць ня буду — яны мне нецікавыя, хаця ёсьць і сярод іх людзі «зь пярчынкай». Сэрца ж маё — з другімі.

Вельмі часта абмеркаваньне прычынаў неэфэктыўнасьці апазыцыйных рухаў круціцца вакол традыцыйна рытарычнага пытаньня: ці то няўдалыя лідэры ў годнага народу, ці то нягодны народ у здольных лідэраў? Пытаньне вартае пытаньня пра курыцу і яйка: іншага народу ў нас няма, а патэнцыйныя праваднікі самі выйшлі з гэтага этнасу і зьяўляюцца ягонай часткай. Але ці сапраўды яны прэтэндуюць на кіраваньне дзяржавай ды грамадзтвам?

Адзіная мэта палітычнай партыі — прыход да ўлады. Той самы БНФ так і ня вырас з «портак» культуралягічнай суполкі. І патроху дэградуе. Раней былі пэўныя посьпехі ды пэўныя амбіцыі, але не хапіла досьведу палітычнай барацьбы. Кожная параза БНФ усprымалася болем у сэрцы ды цяжарам на сумленьні. Сам БНФ рабіў для сябе цікавыя высновы: «Мы так публічна зганьбілі сябе, што нас затое цяпер кожны ведае».

Пытаньне да ўсіх тых, хто называе сябе палітычнымі партыямі: хлопцы, як вы зьбіраецеся прыйсьці да ўлады? Толькі не адказвайце мне нешта банальнае, кшталту: а) эканоміка грохнецца; б) народ пачне пратэставаць; в) заграніца дапаможа. Па-першае, эканоміка ня грохнецца, нават сталінскі тып гаспадаркі дастаткова для падтрыманьня мінімальна неабходнага ўзроўню жыцьця. Я ўжо не кажу пра тое, што спадзявацца на зруйнаваньне эканомікі сваёй краіны неяк амаральна. Па-другое, народ не пачне адкрыта пратэставаць. Наш народ усё робіць паціху, ён нават любіць і ненавідзіць спадцішка. Дуля ў кішэні — вось апагей беларускага масавага палітычнага пратэсту. На актыўную падтрымку Захаду я б таксама не разьлічваў. Наш эканамічны патэнцыял і геаграфічнае становішча для Захаду непрынцыповыя. А абарона асобы, дэмакратыі ды лібэральных свабод — ніщто ў параўнаньні з геапалітыкай. У сёньняшняй жа геапалітыцы Беларусі няма. Дый Захад, як і Ўсход, схільны дапамагаць толькі тым, хто сур'ёзна прэтэндуе на посьпех.

А на чым грунтуецца палітычны посьпех? На добра вядомых рэчах: 1) прывабнай і зразумелай масам ідэалёгіі; 2) арганізацыі і кадрах; 3) стратэгіі і тактыцы барацьбы за ўладу; 4) лідэрскіх якасьцях праваднроў; 5) грошах; 6) Божай ласцы, ці ўдачы. Што з гэтага маем у арсэнале? Пачнём з **ідэалёгіі**. Амаль уся наша апазыцыя ўзьняла на свае сьцягі зацёртыя штампы нянашага мінулага — дэмакратыю і свабоду, рынкавую эканоміку, незалежнасьць ды нацыяналізм. І з гэтым ідзе ў народ. Шаноўныя сябры-дэмакраты, не карміце людзей ідэаламі. Трэба быць прасьцейшымі і грубейшымі ў палітычнай агітацыі, бо мы — нармальная краіна з значнай перавагай прыхільнікаў футболу і піва над прыхільнікамі Шапэнгаўэра і Бэрлёза.

**Арганізацыя і кадры.** Пакуль апазыцыянэры будуць заставацца партыямі сельскіх настаўнікаў, мастакоў ды студэнтаў, г.зн. этнаграфічнымі гурткамі, а не арганізаванай сілай, яны могуць бяз рызыкі займацца «палітычнай» дзейнасьцю — тусоўкамі ў Менску ды жаваньнем гумы ў Брусэлі ці Страсбургу. Трагічны лёс Ю.Захаранкі паказаў, як баіцца ўлада людзей іншага гатунку ў апазыцыі. Як баіцца яна сілы, бо акрамя сілы не разумее і не паважае анічога. Палітычныя партыі інтэлігенцыі не даюць рады нават у краінах разьвітай парлямэнцкай дэмакратыі. Бо ў палітычнага руху мусяць таксама быць і моцныя «цягліцы». Палітычны рух мусіць выпраменьваць сілу, бо сіла вабіць масы.

**Стратэгія і тактыка.** Яны абмяжоўваюцца перакананьнем перакананых ды чаканьнем ці то ўмяшальніцтва вонкавых сілаў, ці то самазабойства ўлады.

**Лідэрскія якасьці.** Народ ідзе не за тым, хто прапануе выбар, а за тым, хто ўказвае шлях — «адзіны» і «верны». Прабадыр, каб павесьці за сабой, мусіць думаць банальна, а прамаўляць страсна. Страсьць — падмурак любога дасягненьня; страсьць нараджае волю — волю пераможа ўсё. У галоўных складніках лідэрства — палітычных інстынктах, хваравітай страсьці, веданьні псыхалёгіі маленькага чалавека, рашучасьці ды волі — Лукашэнка на дзьве галавы вышэйшы за любога іншага беларускага палітыка. Ён вантробай адчувае тое, што мы сілімся зразумець розумам; ён — прыроджаны палітычны дзяяч, інтуітыўны, фанатычны і энэргічны, хоць і дэструктыўны.

Час ад часу падаецца, што пэўным апазыцыянэрам утульна ў акопах апазыцыі, што яны псыхалягічна не падрыхтаваныя ўзяць уладу. Абгрунтаваны страх за свае жыцьцё і свабоду — яшчэ не прычына нерашучасьці. Так, быць шчырым патрыётам-змагаром у сёньняшняй «васільковай» краіне, безумоўна, страшна. Баяцца — ня грэх. Грэх — не дабіваца вынікаў сваёй прафэсійнай дзейнасьці, бо толькі практычныя посьпехі ёсьць крытэрам як палітычнай мудрасьці, так і палітычнай сьмеласьці. А асабістая небясьпека — неад'емны элемэнт палітычнай дзейнасьці ў нецывілізаваных краінах. Таму вялікі гонар і слава тым, хто ёю займаецца, шчыра і аддана. Толькі давайце скончым з ахвярнасьцю. Час паклапаціцца пра мускулы, бо грэць ролю Ісуса ў на палітычнай арэне нам не дадуць — растопчуць.

**Грошы.** Памудрэўшы, Захад ужо не купляецца на абяцанкі: «Дайце нам грошы, і мы зробім справу». Ён адказвае: «Дакажыце, што вы ў стане рабіць справу, і тады мы вам дамо грошы». Пакуль што даюць дробязь на мітусьню, бо і краіна непрыярытэтная, і атрымальнікі невыразныя. Калі ж дойдзе да сур'ёзных справаў, калі зьявяцца рэальныя прэтэндэнты на ўладу, то фінансавыя спонсары стануць у чаргу. Бо ўлада ў Беларусі каштуе невялікія грошы параўнальна з хацецька-эканамічным патэнцыялам краіны.

**Божая ласка, ці ўдача.** Каб Бог на нас увагу зьвярнуў, будзем старацца стаць вышэйшымі. Будзем марыць, будзем расьці, будзем мудрэць. Пастараемся шчыра зірнуць на сябе і сваіх суплеменьнікаў, разабрацца, хто мы ёсьць, без ідэалізацыі і ачарненьня. Гэта будзе першай цаглінай у падмурак самапавагі. Дзеля таго і пішу гэтыя нататкі, у жанры цынічнага рамантызму.

Тая палітычная сыстэма ды сацыяльная мараль, якую мы сёньня маем, ёсьць вынікам нашага супольнага разьвіцьця. Дзяржава — бюракратычнае выяўленьне нашых душ. І калі яна менш багатая і менш гуманная, чым на Захадзе, гэта віна нашая, а не дзяржавы. Адмаўляць, што заходні люд больш пасьпяховы ды здольны за нас, — глупства; успрымаць іх як ворагаў — слабасьць; не хацець у іх вучыцца — дзікунства. Аднак і вучыцца ў іх трэба творча. Мы ня зможам стаць упоравень з перадавымі народамі, калі будзем проста раўняцца на іх. Каб стаць роўнымі, нам трэба стаць першымі. Захад старэе, хутка нехта іншы павінен будзе ўзяць на сябе ролю цягніка прагрэсу. А тут Беларусь, што стагодзьдзямі не раскрывала свайго патэнцыялу. Утопія, кажаце? Пэўна, але толькі высокія мары ўздымаюць дух, без высокіх мараў мы пратухнем. І будзем надалей лічыць маякамі цывілізацыі Польшчу зь Літвой.

А калі ўкладзём у Беларусь сваю душу, свой розум і сваю энэргію, то, можа, і любіць яе станем болей. Бо бяда нашай краіны ня ў тым, што яна недастаткова прыгожая, а ў тым, што недастаткова любая. Беларусь існуе на палітычных мапах, але не існуе ў сэрцах многіх яе грамадзянаў.

Яна нават час ад часу падаецца мне асобнай цывілізацыяй. Асабліва здалёку, калі слухаю Зьмітра Бартосіка ці Лізу Лямбовіч, што пяе свае балады голасам нявыспанага анёла. А потым прыязджаю на радзіму і... глядзіце пачатак артыкулу.

Так, «мая» Беларусь непадобная на сапраўдную. Як, спадзяюся, і Беларусь кожнага з вас. Спадзяюся таму, што мары — стваральныя.

**Васіль Еўдакімаў-Валенцік, Лёндан**



ВОДГУК

## «Час цяпер такі...»

Чаму ўлады раз-пораз імкнуцца зьліквідаваць Гуманітарны ліцэй? Справа ў ліцэістах і ліцэйскім духу. Тут выхоўваюць шчырых, адданых Бацькаўшчыне сьвядомых беларусаў. А гэта цяперашняму зманкуртаванаму кіраўніцтву падаецца найвялікшым грахом. Для яго горш за ўсё тое, што гэтае сьвядомае ліцэйскае юнацтва, атрымаўшы вышэйшую адукацыю, нікуды не зьяжджае ў пошуках сытага жыцьця, а застаецца на Радзіме.

Ліцэй не падобны ні на адну нашу школу. Яго навучэнцы з ахвотай ходзяць на заняткі, прападаюць там цэлымі днямі, нават падчас вакацыяў. У кожным зь ліцэістаў настаўнікі бачаць асобу, якую трэба паважаць і разьвіваць, а не падаўляць. Усё гэта ліцэісты і іх бацькі зьвязваюць зь імем кіраўніка ліцэю Ўладзімера Коласа.

На бацькоўскім сходзе Пятро Брыгадзін некалькі разоў паўтарыў, што прызначэньне спн.Шчарбачэвіч — асэнсаваны выбар. Ніколі не паверу, што разумны чалавек можа ўсур'ёз гаварыць пра ратацыю школьных дырэктараў. Падпісваючы такія загады, чыновенства робіць свой выбар на карысьць няпраўды. З сорамам яны будуць успамінаць пра гэта ўсё астатняе жыцьцё. Сумленьне будзе, як той чарвяк, тачыць і днем, і ноччу.

Успамінаецца адзін малюнак, які даваўся колісь пабачыць: Галгофа з трыма крыжамі, пад якімі Юда дае інтэрвію журналістам. «Разумееце, — кажа ён у мікрафон, — час такі быў».

Так, сёньня мы перажываем ліхую гадзіну. Але выбар кожны павінен зрабіць сам, прыслухаўшыся да голасу менавіта свайго сэрца, свайго сумленьня.

**Аляксандар Цыбульскі, бацька ліцэіста-выпускніка**

## «Гэта напісала жэншчына!»

**На рэспубліканскай алімпіядзе па гісторыі Беларусі сярод каледжаў, што праходзіла ў Салігорску, удзельнікам былі прапанаваныя чатыры ўрыўкі з клясычных твораў літаратуры — патрабавалася адгадаць аўтара і назву.** Першы ўрывак зь «Ліста з-пад шыбеніцы» Каліноўскага, другі — з «Катэхізысу» Буднага, трэці — з «Трэнасу» Смятрыцкага, чацьверты — з эсэ «Адвечным шляхам» Абдзіраловіча. З Каліноўскім удзельнікі справіліся, а вось з астатнімі атрымаліся забуксоўкі.

Асабліва пазьдзіўлялі адказы на ўрывак з «Трэнасу»: тут вам і Цётка, і Геніюш, і Арсеньнева, і невядома чаму Багушэвіч. Настаўнікі ўдзельнікаў таксама ня ведалі адказу. Калі я сказаў, што гэта напісаў Смятрыцкі, яны аднадушна глянулі на мяне як на вар'ята, а найбольш нахабная спачувальна сказала: «Хлопчык, ты што, ня відзіш, што гэта напісала жэншчына!» Буднага таксама не адгадаў ніхто, большасьць згадзілася на пэрсоне Скарыны. А гэта ж творы з школьнай праграмы!

Большасьць настаўнікаў літаратуры лічыць неабавязковым паглыблена выкладаць літаратуру XV—XVIII ст., абмяжоўваючыся постацямі Скарыны, Буднага ды Гусоўскага і «Песьняй пра зубра» апошняга. І сярэднестатыстычны выпускнік школы нічога ня ведае пра летапісы і Статуты ВКЛ, пра Хрыстафора Філалета, Пятра Скаргу, Іпація Пацея дый нават пра таго самага Смятрыцкага і ягоны «Трэнас» або Афанасія Філіповіча зь ягоным «Дыярыюшам». «Залаты век» беларускай культуры і літаратуры ўсё яшчэ застаецца «белай плямай» для простага спажыўца-чытача. Крыўдна...

Ня лепшая сытуацыя зь веданьнем літаратуры XIX ст. Альгерд Абуховіч, напрыклад, невядомая пэрсона і для настаўнікаў літаратуры, што казаць тады пра дзяцей. Твораў Адынца, «Альбому» Вярыгі-Дарэўскага няма ў школьнай праграме, затое там поўна адводзіцца ўрокаў на разбор творчасьці Петруся Броўкі, Пімена Панчанкі, Івана Шамякіна etc.

Беларусы нават на элемэнтарным узроўні ня ведаюць айчыннай літаратуры і гісторыі, але працягваюць лічыць сябе адной з найбольш адукаваных нацыяў сьвету.

**Адась Галубовіч, Барысаў**

З ЖЫЦЬЦЯ ВІЛЬНІ

## Прарыў у графіцы, заняпад у ілюстраваньні

**У віленскім Цэнтры сучаснага мастацтва экспануецца выстава «Графіка».** Сотня твораў эстампу, малюнку, кніжнай ілюстрацыі, фатаграфіі ды іншых красамоўна сьведчыць, што краіна выходзіць ня толькі на палітычнае збліжэньне з Эўропай. Выстава дэманструе годнасьць і творчы патэнцыял, зь якім ня сорамна далучыцца да Зьвязу.

Адметна, што літоўскі эстамп даўно перадолеў беларускую праблему недахопу цынкавых пласьцінаў ды літаграфскіх камянёў, якія дзеля рэжыму эканоміі з кожным годам становяцца ўсё меншага фармату. Хутка наша графіка ператворыцца ў паўсюдны міні-прынт, у якім мы сапраўды дасягнулі міжнароднага прызнаньня. Літоўскія творцы перайшлі на дошкі, фанэру ды іншыя асновы, якія далі магчымасьць ня толькі пашырыць палітру фактураў ды эфэктаў, але і дасягнуць шматметровых фарматаў.

Асобным разьдзелам дэманстраваліся модныя цяпер творы з паперы ручнога вырабу — вялізныя і маленькія інсталяцыі, станкавыя лісты, малюнак якіх утвараецца з суплётаў і напластаваньня рознакаляровых валокнаў цэлюлёзы. У выставачных залах гарэлі нават сьвяцільні, зробленыя з паперы.

Але асабліва ўразіла асобная міжнародная экспазыцыя «Кніга-2003», якая адбываецца ў рамках выставы «Графіка». Дзясятак мастакоў з усяго сьвету прадстаўляюць унікальныя кнігі, зробленыя ў адзінкавых экзэмплярах. Як строі ад куцюр'е, якімі мы захапляемся толькі на паказах мод. Пасьля выставы тыя кнігі разыдуцца па калекцыях музэяў і прыватных асобаў.

Што тычыцца кніжнай ілюстрацыі, дык тут мы можам паспрачацца зь літоўцамі за першынство. У параўнаньні зь іншымі гэты разьдзел на выставе сьціплейшы колькасна і якасна. Вядома, тут ёсьць самыя разнастайныя тэхнікі выкананьня і вобразы, але гэта далёка ня тое багацьце, якое было раней. Магчыма, даступнасьць кампутара пазбавіла мастакоў кнігі неабходнасьці проста маляваць. Таму прыемна адзначыць вартасьці нашых «тачыльшчыкаў».

**Дзяніс Раманюк**

# Praviły hulni ŭ piasku

**Heta ŭsio budzie ŭ žniŭni. Buduć prajšoŭšy ŭsialakija letnija semestry, Kupalli, Basoviščy i inšyja vyciečki. Nastanie čas vyjšci na «Šlach z varahaŭ u hreki». Heta vuzki i ciažki šlach. Nia tolki tamu, što pralahaje jon skroź piasok. Najhorš toje, što napramak našaha «Šlachu» piarečyć papularnamu sionńnia kirunku Ŭschod—Zachad. Biełarusi ž, kab znajści svajo miejsca na ziamli, musova zasvojić inšuju voś kaardynat.**

Vam 18—28 hadoŭ. Vy hłyboka pierakananyja, što žyć «kak vse» nielha, što treba šukać inšaha šlachu. Vy chočacie stvaryć svaju krajinu. Vy nie razmaŭlajecie na movie akupanta, Vam śniacca sny pa-biełarusku… Značyć, my šukajem mienavita Vas. U «Lehiendzie ź piasku» Vas čakaje tydzień volnaha žyćcia i niepasilnaje pracy. Vas čakajuć dzikija ŭmovy piaščanaha karjeru, hetkaha aazysu naadvarot, — dalina sucelnaha piasku kraj: historyja, mitalohija, ambasady, dyjaspary, adrasy ŭ Siecivie. Dobra było b razvučyć ź biełarusami paru «svajich» nacyjanalnych piesień.

Delehacyji zamiežnikaŭ składajucca z 3-4 čałaviek — pierakładnika na biełaruskuju ci anhielskuju movy, navukoŭca, artysta, jakija raspaviaduć dy śpiajuć la supolnaha vohnišča pra svoj narod na Šlachu z varahaŭ u hreki, i, nareščie, skulptara — kiraŭnika tvorčaj supołki.

U pieršyja dni my naładzim ekskursiji pa Zasłaŭji, Połacku. Paśla atabarvajemsia ŭ karjerach pad Zasłaŭjem, dzie i zasnoŭvajem na piasku krajinu-lehiendu. Mnie jana mrojicca ŭ dziaržaŭnych kštałtach. 30 udzielnikaŭ pleneru — kapalnikaŭ skulptur — raźmiarkoŭvajucca pa ministerstvach.

*Ministerstva haspadarki* arhanizuje žytło ŭ namiotach, kuchniu, dziažurstvy i h.d. *Ministerstva pracy* zojmiecca kapańniem ź piasku skulptur. Našy hości pryvoziać svaje lehiendy (lubyja pavodle siužetu). Kiraŭniki ŭ pieršy dzień vykonvajuć z hliny eskizy da budučych skulptur. A kapajuć usie, bo pracy šmat. Naš plener nia konkurs, a


«Rahnieda», Zasłaŭje-2000.
IREX-PROMEDIA

pasiarod žnivieńskaj zielaniny. A načami — pieśni tych narodaŭ, što žyvuć na Šlachu z varahaŭ u hreki.

Naš plener piaščanaj skulptury hetym razam prymaje haściŭ z 10 krajin: Daniji, Narvehiji, Finlandyji, Švecyji, Estoniji, Łatviji, Litvy, Ukrajiny, Małdovy i Hrecyji. Da kožnaj hrupy z našaha boku pryznačajecca *kuratar* (najlepš student ci vypusknik MDŁU). *Kuratar* pavinien: vałodać movaj «svaje» nacyji ci anhielskaj, jak maha hłybiej daviedacca pra «svoj»

«Mindoŭh», Navahradak-2002.


ANATOL KLAŠČUK

fest družby.

*Ministerstva achovy zdaroŭja* składajecca z adnaho studenta-medyka. Hetaha dastatkova, kab papiaredzić: «Paleńnie škodzić Vašamu zdaroŭju!»

*Ministerstva navuki* navučyć biełarusaŭ, jak vybrać ź mitalohii siužet dla našaj skulptury. Jano ž rychtuje kanferencyju, jakaja viadziecca štoviečara la vohnišča pad zorami Mlečnaha Šlachu. Jano ž viadzie letapis tydnia. A taksama vydaje kataloh pleneru z fatazdymkami, tekstami lehiendaŭ, vycinkami z kanferencyji i letapisu.

Adnojčy ja sustreŭ znajomaha mastaka i kažu: «Kališci, jak byŭ Paźniak u Viarchoŭnym Saviecie, ty razmaŭlaŭ pa-biełarusku. Što ž z taboj stała sionńnia?» — «Да панимаешь… как-то жизнь не заставляет…» Naš prajekt jakraz i zaklikany stacca tym «žyćciom, jakoje prymušaje», kab asiarodździe razmaŭlała z nami pa-biełarusku. I prymušajem my nie z vyšyni jurydyčnaha zakonu, a ŭ ramkach hulni. Praŭda, hulnia ŭ nas surjoznaja — my majem *siłavyja struktury*, što składajucca z *Pamiežnych vojskaŭ* i *Ŭnutranaj (Moŭnaj) palicyji*. Udzielniki rycarskich ci spartovych klubaŭ, dałučajciesia! Naša krajina maje taksama ŭłasnuju valutu i, adpaviedna, ułasny *Minfin*. Jon vałodaje manetnym dvarom (dzie drukujucca talery ŭ vyhladzie suveniraŭ), šapikam abmienu valuty (dzie hości nabyvajuć tyja suveniry) dy inšymi biurakratyčnymi kantorami.

Plener zavieršycca hrandyjoznym festam. Załunaje ŭ niebie vializny balon, zahrymić rok-kancert, a chieŭra bajkieraŭ padymie buru ŭ pustelni. Žjedziecca šmattysiačnaja publika. U takich umovach pabolšaje pracy dla Minfinu i asabliva dla *Moŭnaj palicyi*. My dzielimsia na hurtki pa 2—3 čałavieki: palicyja i pierakladnica. My snoŭdajem pamiž hledačami i prysłuchoŭvajemsia, dzie chto чирикает. Abraŭšy «achviaru», pryciahvajem jaje da hulni takim čynam: palicyjant začytvaje zakon i prapanuje pierakładčici na biełaruskuju movu apošniuju frazu. Kali parušalnik zakonu nia ŭmieje ci nia choča, jamu prapanujecca pasłuhi pierakładnicy. Pabačyŭšy jaje jasnyja vočy, pačuŭšy aniolski hałasok, złosny parušalnik miakčeje, uviazvajecca ŭ hutarku. A jana tuju hutarku pierakładaje. Nareščie palicyjant padaje «złačyncu» rachunak za pierakład, biare jaho pad biełyja ručańki i pramaŭlaje: «Vy majecie prava maŭčać pa-biełarusku. Kožnaje słova, pramoŭlenaje Vami pa-rasiejsku, moža spryčynicca da hibieli našaj nacyji». Potym pravodziać skroź šerah biurakratyčnych kantor, dzie «złačynca» nabyvaje talery i vypłačvaje jimi karu. Na pamiać pra hetu praceduru jamu ŭručajecca kvitancyja. Dy takaja pryhožaja, kalihrafičnaja, što nia soram na ścianu paviesić u ramcy, kab hanarycca: «Mianie pakarali, bo nie šanavaŭ rodnaj movy». Chto, dzie i kali ŭ RB ci BSSR pakaraŭ za heta?

Šanavać i abaraniać rodnuju movu — norma dla luboj nacyji. Ale chto ŭ Biełarusi trymajecca takoj moŭnaj normy? Pajšoŭ ja niejak pašukać da siabie padobnych. Była abviestka ŭ «NN», što ŭ tupiku stancyji metro źbirajucca nacyjanalisty. Pryjechaŭ, baču: troje chłopcaŭ spartovaha składu. Značyć, jany. Ale znajomstva, dumaju, pačnu z parolu. I skazaŭ viadomaje ad časoŭ Kalinoŭskaha: «Kaho lubiš?» A ŭ adkaz pačuŭ: «В смысле?..» Nie razumieju ja takich «nacyjanalistaŭ».

A niejak ja trapiŭ na adnu biełaruskamoŭnuju tusovačku maładych intelektuałaŭ. Času na dyskusiju było vielmi mała. Ja skazaŭ: «Biełarusami źjaŭlajucca tolki tyja, chto razmaŭlaje pa-biełarusku». — «A dla nas mova — na dziasiatym miescy. My vyznačajem biełarusaŭ pavodle mentalitetu». Na tym i razyšlisia.

Upieršyniu ja pačuŭ hetaje modnaje słova hadoŭ dvanaccać tamu, ale da hetaje pary nia ŭmieju ŭžyvać jaho u kantekście. Mo chto navučyć? Taki prykład. Jedu ja ŭ traliejbusie i čuju za płačyma: «Skasujcie, kali laska, talončyk». Hetaha mnie dastatkova, kab upeŭnicca, što ja nie apošni mahikanin, što pobač sa mnoj, płačo ŭ płačo, stajić biełarus. A heta, zhadziciesia, niemałavažny faktar dla isnavańnia nacyji. A jak być z mentalitetam? Jak jaho pamacać u tym ža tralejbusie, bitma nabitym? Jak pierakanacca, što ŭ hetaha, skažam, mužčyny — o-ho-ho jaki biełaruski mentalitet! A ŭ toj kabiety — tak sabie.

Ja chacieŭ by znajści siarod moładzi adnadumcaŭ, čyje pohlady hruntujucca nie na chistkaj postmadernisckaj dryhvie, a na kankretnaj asnovie. Dla jakich słovy «nie pakidajcie ž movy» — nie naftalin, a klasyka. Časam prychilniki «mentalitetu» supakojvajuć mianie: «Dy nia źniknie nikudy naša mova. Nia treba za jaje zmahacca, abaraniać i h.d.». Nie, movy pamirajuć, i heta — historyčny fakt.

Chto adčuvaje ŭ sabie moc paviartać chadu historyi — adhukniciesia. Patelefanujcie 209-05-81 i skažecie, što Vašy dumki taksama lažać u napramku našaha «Šlachu z varahaŭ u hreki».

I my pačniom historyju spačatku.

**Henik Łojka**

«Mahiła Iva», Mahiloŭ-2001


ŽMICIER RAHAČOŬ

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

# Чорная Панна чакае рыцараў

**Беларусы пры канцы 1980-х, вяртаючы гісторыю, вышывалі кашулі ды аднаўлялі рэцэпты крупніку.** За дваццаць гадоў мы пасталелі на некалькі стагодзьдзяў ды перайшлі ад родавай абшчыны да фэадальнага ладу. Ані гістарычнымі клюбамі, ані мэдыявісцкімі фэстамі Беларусь ня зьдзівіш. І яшчэ адзін мае прайсьці неўзабаве: 3—4 ліпеня ў Нясьвіжы.


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Арганізатары — між іх Ігар Міхна — абяцаюць адначасовыя канцэрты (сярэднявечча й фольк) на дзьвюх пляцоўках («Тройца», «Стары Ольса» зь Беларусі, «Open Folk» з Польшчы, «Drolls», «Laterna Magica» з Расеі, упершыню — музыкі зь Вялікай Брытаніі). Канцэпцыя фэсту — «жывая гісторыя»: узнаўленьне абрадаў, рамёстваў, тэхналёгій, стравاў, напояў, лекарства, фэхтаваньня. Прычым усё гэта — інтэрактыўнае (гледачы змогуць прымераць строі, за пэўную плату пабіцца з рыцарамі, сьпячы блін і да т.п.). Яшчэ арганізатары абяцаюць агнявое шоў; водную бітву «Ўзяцьце Гібралтару», старую забаву Радзівілаў; дабрачынны фэст «Музыка замкаў і ваколіцаў» (грошы — на рэстаўрацыю Нясьвіскага замку); відэапрэм’еру «Настасьсі Слуцкай» (пакуль па-расейску, але пазьней абяцаюць агучыць і па-наску). Як выжывалі ў Сярэднявеччы дыябэтыкі, распавядуць (і прадэманструюць) сябры клюбу дыябэтыкаў. А адмыслоўцы зь вядомай кампаніі, якая фундуе праект, прэзэнтуюць калекцыю сярэднявечнай бялізны.

Арганізатары разьлічваюць, што аўдыторыя фэсту складзе за два дні 50 тыс. чалавек.

У першы дзень фэст будзе цягнуцца з 12.00 да 1.00, у другі — з 11.00 да 22.00. Даехаць да Нясьвіжу зь Менску можна аўтобусам — у 9.00 з вул.Дружная (квіток каштуе 16 тыс. руб., для дзяцей — 10 тыс.). Электрычкай — таньней: да ст. Гарадзея (берасьцейскі кірунак), а потым рэйсавым аўтобусам да Нясьвіжу. Хто едзе на два дні — бярыце намёты ды ежу. Паглядзім, якія абяцанкі спраўдзяцца ў Нясьвіжы і ці прыхільна сустрэне нэарыцараў Чорная Панна.

**Крыся Пацучынская, Сяргей Будкін**

прэм'ера

# Зэўс–бізнэсовец і Вэнэра–німфаманка

**У Акадэміі мастацтваў нядаўна паказвалі «Тараса на Парнасе» — дыплёмны спэктакль чацьвертакурсьнікаў, пастаўлены рэжысэркай Натальляй Башавай.**

П'есу паводле ананімнага твору напісаў Сяргей Кавалёў. Інтэрпрэтацыя значна адрозьніваецца ад арыгіналу. З спэктаклю нашмат больш можна даведацца пра жыцьцё й прыгоды палясоўшчыка Тараса. Дзядзька вартуе лес і балота ў пана Севярына. Тарасова дачка Зоська, гадаванка пані Вэранікі, зьбіраецца замуж за «культурнага» хлопца з «сабачым» імем Віктор і грэбуе добрым асілкам Грышкам.

Незадаволены выбарам дачкі, разбэшчанай панскай адукацыяй, Тарас ідзе зранку ў лес. Сярод бярозак і соснаў ён пачуваецца чалавекам. Увечары ў дачкі заручыны. Дзядзька сядзіць, паліць люльку й разважае, як быць у дачыненьні да надта ўжо самастойных дачкі й жонкі. Якраз тут яго і спатыкаюць пан Севярын з пані Вэранікай. Працавітасьць Тараса падштурхоўвае пана сказаць палымяны сьпіч пра пэрспэктывы беларускага народу, які, у сваіх асобных прадстаўніках, можа, і ня горшы за немцаў ды ангельцаў. Пан у спэктаклі — чалавек нацыянальна сьвядомы, поўны вызвольных інтэнцыяў, але летуценны й парадыйна разгублены, так што нават ня ведае, супраць каго ж яму ўздымаць свой народ. З гэтай нагоды Севярын раіцца з жонкай, якая яго ўсё супакойвае, а сама настаўляе мужу рогі з «культурным» Вікторам.

Падчас аднаго з таемных спатканьняў побач з каханкамі зьяўляецца мядзьведзь. На крыкі пакінутай баязьлівым палюбоўнікам Вэранікі прыбягае Тарас, страляе... Але ж стрэльба ягоная была наладжаная на цецерукоў! Дзядзька валіцца зь лесьвіцы, якая ёсьць асноўным стацыянарным элемэнтам дэкарацыяў, і апынаецца на Парнасе. У незнаёмай мясцовасьці зь пяцьцю паўмесяцамі ў небе Тараса сустракае залатавалосы й кучаравы Амур у акулярах, які гарэзьліва кідае дзядзьку аднаго. На дапамогу яму прыходзіць Геркулес, які за шкірку зацягвае Тараса на Парнас.

Там балююць ды сварацца багі. Пасьля таго як уцёк далей ад іх Зэўс, боская гаспадарка лягла на плечы Геры, а тая ня можа даць рады свавольным багам. Яны імкнуцца да ўлады, б'юцца за першынство ў каханьні, строяць хітрыкі ды выхваляюцца адзін перад адным. Варагуюць пазашлюбныя дзеці Зэўса Апалён і Бахус. Геба пярэчыць волі бацькі ды зьбіраецца замуж за каварнага Марса, а не за прастадушнага Геркулеса. Вэнэра здраджвае кульгаваму Вулькану, якога возяць па сцэне ў інваліднай калясцы механічныя дзеўкі.

Гера зьвяртаецца па дапамогу да Тараса, бо, дзякуючы стрэльбе, яго ўсе памылкова прымаюць за Зэўса. Спачатку верны муж Тарас адмаўляецца, але Гера гэтак падобная да ягонай жонкі Парaскі, асабліва калі тая плача! І тады просты, але мудры вясковы дзядзька робіцца ненадоўга Зэўсам і вырашае амаль усе боскія сямейныя клопаты. Міраццa Апалён і Бахус, выкрытыя інтрыгі Марса й Вэнэры, Геба схіляецца сэрцам да адданага Геркулеса. Калі нарэшце вяртаецца Зэўс, нават яго ёсьць чаму павучыць добраму чалавеку. Тарас ушчувае яго за распусту й неадпаведнае выхаваньне сваіх шматлікіх дзяцей ад розных шлюбаў. Прысаромлены Зэўс слухае ня вельмі ўважліва, але віну прызнае. Выглядае Зэўс пры гэтым як бізнэсовец, што дзеля гэткай ужо важнай тэатральнай нагоды адключыў сотавы, але ўвесь час памятае пра тое, што яму тэлефануюць па справах.

За заслугі перад багамі Тараса адпраўляюць дахаты. Разам з Амурам яны ўзыходзяць на лесьвіцу пасярод сцэны і, гледзячы ў залю, махаюць рукамі, як крыламі, — быццам птушкі лятуць у вырай. А ў хаце Тараса гаруе жонка Параска. Пазьбіраліся на заручыны госьці. Зоська нямаведама чаму абрала-такі Грышку. Усе чакаюць гаспадара: і кульгавы Ахрэм, і п'яніца Базылька, і адрынуты Віктор, і статны прыгажун Сымон. Пакуль Тарас вырашаў праблемы багоў у сьвеце зь пяцьцю паўмесяцамі, у хаце ў яго ўсё вырашылася само сабою.

Дзядзька вяртаецца дахаты жывыздаровы, і пачынаюцца скокі ды танцы. Прыяжджаюць пан з паняй, і зноў не абыходзіцца без урачыстых прамоваў пра высокія памкненьні. Тарас атрымлівае ад пана новую «апцічаскую» стрэльбу замест зламанай на Парнасе Бахусам, а маладыя ад пані — кучаравага Амура ў акулярах. У падагрэтага прыгажосьцю Геры Тараса наперадзе, відавочна, новыя мядовы месяц з Параскай.

Сканчаецца спэктакль, як і пачынаецца, вясёлымі танцамі. Яны робяць пастаноўку проста фэерычнай. Хоць прысутных на спэктаклі дзяцей забаўлялі нават асобныя рухі актораў — варушэньне броваў Тараса й ягоныя задумлівыя позы.

Дзяніс Арцюкоўскі вельмі арганічна выглядае ў ролі Тараса. Проста дзівішся, як натуральна, зь якім цёплым дарэчным гумарам гэткі малады чалавек грае дасьведчанага сталага дзядзьку-палясоўшчыка. Яшчэ адной цудоўнай знаходкай рэжысэркі зьяўляецца Бахус у выкананьні Аляксандра Ўнуковіча. Безумоўным фаварытам публікі стаў Дзьмітры Есяневіч у ролі Геркулеса/Грышкі. Вялікі, моцны, плястычны ў танцах і бойках, шчыры сэрцам Геркулес як найлепш увасабляе вобраз беларускага героя-асілка.

Вялікую справу робяць у гэтым спэктаклі Ірына Мядзьведзева й Вольга Ерахавец, што граюць гістэрычную німфаманку Вэраніку/Вэнэру. Заганнасьць вобразу адлюстроўваецца так удала, што можна было б параіць надта хворым на каханьне жанчынам хадзіць на спэктакль у якасьці арт-тэрапіі.

Гісторыя пра чысты (хоць і не бездакорны) народ і пра разбэшчаную арыстакратыю паноў і багоў (не пазбаўленых, праўда, прывабнасьці), алюзіі на тонкі й матэрыяльны сьветы, казачна-калядная сцэнаграфія (Ганна Мятліцкая), трапная музыка й тонкі гумар прыцягнуць не аднаго гледача.

Дарэчы, камэнтар гледачоў: «А ўсё пачалося з таго, што ён раскурыў люльку...»

**Марыя Салаўёва**



# Хто паедзе на Басовішча

**Цягам двух дзён у клюбе «Сафары» праходзіў адбор на «Басовішча-2003».** Сам фэст адбудзецца 18 і 19 ліпеня ў мястэчку Гарадок (Беласточчына). З сарака гуртоў-прэтэндэнтаў журы, у складзе якога былі арганізатары «Басовішча», журналісты ды музыкі (С.Корань ды А.Памідораў), выбрала восем лепшых. Сёлета на «Басовішча» паедуць прадстаўнікі розных кірункаў музыкі: «Тарпач» — рэпрэзэнтанты гард-кору, як і адкрыцьцё мінулага году «Куклы»; «IQ-48» — рэпэры; берасьцейскі гурт «Сьцяна», які грае гард-рок. Не абыдзецца без «экстрэмалаў» — «Imprudence» і «Тэзаўрус» (ex-«Armageddon»). Патрапяць на фэст і зусім маладыя гурты — «Аніма» і «Indigo». Апошні існуе ўсяго чатыры месяцы. Сёлета склад удзельнікаў менш «мэталёвы», чым летась: у 2002 г. з васьмі гуртоў-пераможцаў шэсьць былі «экстрэмальныя».

Акрамя гэтых васьмі камандаў, у «Басовішчы» возьмуць удзел «NRM», «Уліс», «Крама», «Нэйра Дзюбэль», «Partyzone», «Дзе я ня я» з Баранавіч, «БН» зь Бярозы і два гарадзенскія гурты — «Кальян» і «Deviation».

Арганізуецца паездка для гледачоў. Тэл. для даведак 256-46-07, 8-029-649-08-88.

**Сяргей Будкін**

# Аўтасалён у тэатры



У Магілёўскім абласным тэатры драмы і камэдыі імя Дуніна-Марцінкевіча, што ў Бабруйску, неўзабаве адбудзецца незвычайная прэм'ера. У памяшканьні тэатру адчыніцца аўтасалён. Арандатар — тэатральны з дадатковай адказнасьцю «Інкомба» — падпісала дамову аб выкарыстаньні храму Мэльпамэны на пяць гадоў. У фае на плошчы ў 76,7 кв.м адначасова будуць выстаўляцца 5—6 новых іншамарак. Ухвала гарвыканкаму ўжо маецца. У сярэдзіне 90-х тэатар ужо выкарыстоўвалі пад нетрадыцыйныя патрэбы. Тады ў ім месьціліся казіно да відэасалён.

Канкрэтныя ўмовы дамовы застаюцца таямніцай. Каардынаты фірмы невядомыя нават дырэктарцы тэатру Веры Ільічовай. Яна кажа, што зь ёй ніхто ня раіўся. Аднак сам факт адкрыцьця аўтасалёну яна ўспрымае станоўча: «Частка сродкаў ад арэнды павінна перападаць і ў тэатру». Паводле папярэдняй інфармацыі, прэзэнтацыя аўтасалёну адбудзецца ў Дзень гораду — 29 чэрвеня.

Афіцыйна тэатральны сезон цяпер закрыты да верасня-кастрычніка. Акторская трупа працягвае працаваць у разьездах — летніх лягерах, дамах адпачынку. Большасьць заўзятых тэатралаў з нагоды адкрыцьця аўтасалёну выказваецца досыць крытычна. Тэатар павінен заставацца тэатрам, а аўто ў ім — гэта нонсэнс. Акторы ў сваіх выказваньнях асьцеражнейшыя. Прызнаючы, што тэатар і аўто рэчы несумяшчальныя, яны разам з тым спадзяюцца, што гэта паспрыяе паляпшэньню цяжкой сытуацыі, у якой апынулася культурная ўстанова.

**Віктар Качан, Бабруйск**

ДЫСКАГРАФІЯ

# Крамбамбуля. Каралі раёну

Крамбамбуля (р) 2003




Такой супэркічавай вокладкі ня меў яшчэ ніводзін беларускі дыск: ружовыя, фіялетавыя, памаранчавыя зоркі і палосы, бэз і лёгка пазнавальныя «вясёлыя чалавечкі». Для чысьціні жанру не стае дзеўкі з голымі цыцкамі. Сярод спонсараў — такія рэдкія для белпрадукту птушкі, як «Белорусская газета», «Обозреватель» і БТ.

Тры рок-дыназаўры — Вольскі, Кулінковіч і Міхалок — аддаліся ўспамінам пра бясхмарнае юнацтва ў гарадзкіх дварах. Пачынаецца праграма, па добрай энэрэмаўскай традыцыі, полечкай. Музыкі запрашаюць даверлівага слухача на «Сьвята крамбамбулі» — такі агульнабеларускі карнавал зь сьвіцязянкамі-куртызанкамі й велічнымі замкамі — ды заклікаюць: «Будзьма сьмяяцца!». Але прапанова правакацыйная: альбом вытрыманы хутчэй у міноры.

У адрозьненьне ад «Крамбамбулі-1», песьні тут ня маюць выяўнае стылізацыйнае прывязкі. Апроч хіба «Старых гіпаноў», у якіх пазнаецца ВІА «Сіняе неба». «Работа» пачынаецца як супэргіт «Сяброў» «Вы шуміце, бярозы», а далей нагадвае кранальную песьню «Серёжка с Малой Бронной», прасьпяваную хорам адзінаццацікласьнікаў на выпускной вечарыне. Але песьня не пра вайну, а пра любоў. Хоць пэўны мілітарызм прысутнічае: кухарка кахае салдата. У пройгрышы нечакана зьяўляецца матыў «бэсамэ мучa», і як вынік — шчасьлівы фінал: каханы вяртаецца з Каўказу жывы.

Аранжыроўкамі другая «Крамбамбуля» не слабейшая за першую. У песьні «Госьці» прачынаецца файная трагічна-«кабацкая» скрыпка, у песьні «Новы год» труба грае вар'яцкі рэмікс на вальс «Амурскія хвалі». Аўтары «Новага году» — Саша і Сірожа. Аднак нармальных паланоў за «граматным» беларускім тэкстам не відаць. Пазнаюцца, хіба, сьветапогляда, бо п'юць упераменку піва, віскі і кагор. А ў песьні №7 выкарыстоўваецца такі рэдкі музычны інструмэнт, як піла. Яна тоненька пішчыць на фоне «тэксту»: Кулінковіч імпэтна прамаўляе словы «крамбамбуля». Не ўпершыню яму сьпяваць такія песьні. Хоць наступная ягоная — «Марскі чалавек» — уражвае праблемнасьцю і прыгажосьцю. Гэта трагічная гісторыя вэтэрана ВМС, які не перажыў таго, што родная Беларусь ня мае выхаду да мора. Выпадак не адзінкавы: іншы такі «марскі чалавек» усё ня мог супакоіцца, што жыве не ў касьмічнай дзяржаве.

Альбом менш алькагалізаваны за папярэдні — напоі слабейшыя дый не пра іх гаворка. Але піву прысьвечаныя аж дзьве песьні. У адной Вольскі разважае, чаму ж, уласна, таго піва хочацца. Па-ігонаму выходзіць, людзі п'юць ад нявыкруткі, калі «шанцаў на фінал шчасьлівы амаль няма»... Зусім была б дэпрэсіўная песьня, калі б ня лёгкая «таранцінаўшчына» ў музыцы. У іншай кампазіцыі, прысьвечанай безалькагольнаму піву, градус большы. Калі пераказаць зьмест у трох словах — рок-н-рол, аўтамабіль і шкадаваньне, «што іншае піва піць за стырном немажліва».

Заключная, энэргетычна сьветлая «Люблю» — пра простыя чалавечыя радасьці. Дарма прадусарка Анечка Вольская казала, што ў альбоме няма «інтэлігенцкага геаграфічнага гумарку». На «Люблю», дарэчы, зроблены досыць удалы дыскатэчны мікс — сашы, сірожы і наташы будуць «каўбасіцца» на поўную катушку.

«Каралі раёну» — не для рамантычнага спатканьня ці сьпеваў пад гітару ля вогнішча. Але для застольля ці рамонту аўтамабіля — самая тая музыка.

**Ігар Няхведараў**

Наступны нумар «НН» выйдзе **11 ліпеня**, у пятніцу. У Менску ў продажы — з абеду чацьвярга.

ЗБМ «Беларускі Шлях» запрашае далучыцца да вандроўкі на сярэднявечны фэст у Нясьвіжы. Арганізаваная адпраўка аўтобусамі: ад'езд 3 ліпеня раніцай. Прыезд 4-га ўвечары. Магчымая начоўка ў аўтобусе.
Агульны кошт: 15 000 рублёў. Кантакты: 232-54-58, 8-029-622-57-20 (Зьміцер), 264-12-38 (Павал)

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Сябры** незарэгістраванага ГА «Грамадзянскія ініцыятывы» глыбока смуткуюць у сувязі зь сьмерцю Васіля Быкава. Усё сваё жыцьцё ён заставаўся Чалавекам зь вялікай літары, актыўным змагаром з абыякавасьцю і рабскай псыхалёгіяй, пасьлядоўным абаронцам ідэяў незалежнасьці й дэмакратызацыі беларускага грамадзтва. Памяць аб гэтым сьветлым чалавеку будзе вечна жыць у сэрцы кожнага сумленнага беларуса.

**Ліцэісты**, не пускайце розную набрыдзь у свой дом. Сяргею Міхалычу прывітаньне. Генадзь

**Шаноўны** Юры Хадыка! Віншуем Вас з 65-гадовым юбілеем! Зычым шчасьця, здароўя і свабоды. Біблійцы

**Прафэсару Хадыку** ў Дзень народзінаў за краты:

Свой Дзень народзін Вы маглі б, прафэсар,
Сустрэць у славе, у пашане і фаворы,
Заслугі Вашы ацаніў бы й кесар,
Калі б зьмірыцца здолелі ў пакоры.
Але Вы выбралі супраціўленьне,
Калі Народ, Радзіма за плячыма,
Сваю любоў, цярпеньне і сумленьне,
Свабоду ўсклалі на алтар Айчыны.
Вы не скарыліся падману, крыўдзе, зьдзеку,
Што чыніць здрада з подласьцю ў хаўрусе,
І ўзьняцца здолелі вы ў гэтым веку
Тытанам Адраджэньня Беларусі!

Сьвятлана Багданкевіч

**Віншую** ліцэістаў і выкладчыкаў МДГЛ з пасьпяховым заканчэньнем навучальнага году. Будзем разам у верасьні! Яня

**Віншую** ўсіх выпускнікоў дзявятых клясаў. Уладзя

**Віншуем** Сяргея Лескеця з днём народзінаў і выхадам першай кніжкі. Сябры

### КАНТАКТЫ

**«Гасподзь** у агні і мечам Сваім учыніць суд над усякаю плоцьцю...» (Ісая 66:16). Кожны аўторак а 18 гадзіне беларускамоўнае богаслужэньне ў царкве «Ласка Божая», Гурскага, 48

**Запрашаем** на Купалавы чытаньні да помніка Паэту ў парку Янкі Купалы. Кожную нядзелю а 17.30. Жыве Беларусь!

**Шукаю кантактаў** зь Беларускімі патрыётамі. А/с 414, 22120, Барысаў

**Запрашаем наведаць** «Віртуальную амбасаду вёскі Калодніца»: http: //kalodnica.by.ru

**ZBSB.org** — сайт Згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына». Т.: 289-31-94

**Мазырчукі,** якія едуць у летнік «Палятыда», адгукніцеся. Едзьма разам! Т.: 2-69-55. Алег. Тэрмінова!

**Шукаю кантакту** з патрыятычнымі суполкамі. extrim78@tut.by

**Спадары Супаненкі**, прывітаньне. Янка паехаў на вадаспад. Генадзь

**Сорамна** за беларускую чыгунку: у эл. цягніках аб'явы гучаць па-расейску. Мацкевіч

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Кнігі — поштай.** Замаўляйце каталёг — поштай: а/с 333, 220050, Менск; e-mail: exlibris@tut.by; Internet: http://exlibris.cjb.net. Т.: 8-029-643-57-33

**Кнігі — поштай. Новае:** «Наша Ніва. 1911 г. Факсымільнае выданьне», «Беларусь. Гістарычнае падарожжа для дзяцей», «Лагодны Цмок. Зборнік ангельскіх казак»

**«Ордэн Белай Мышы»,** новую кнігу Ўладзімера Арлова, можна пабачыць на кніжнай выставе ва Ўправе БНФ (вул. Варвашэні, 8)

**Усё пра моладзь** 1970—85 г. нараджэньня — у кнізе Паўла Севярынца «Пакаленьне Маладога Фронту» ў Інтэрнэце: mfront.org або knihi.com

**Olsa.by.ru** — сайт беларускай сярэднявечнай музыкі

**Bykau.by.ru** — усё пра Васіля Быкава

**www.belreform.org** — сайт, прысьвечаны 450-годзьдзю Рэфармацыі ў Беларусі

**Амаль дапрацаваны** пераклад стужкі «Ўладар Пярсьцёнкаў» часова знаходзіцца на сайце dol.by

**Паштоўкі** зь Менскам і іншымі гарадамі Беларусі 1900—30-х г. (30 шт.) памяняю на аналягічныя з Гомелем і гарадамі Гомельскай вобласьці альбо прыму ў падарунак (для дасьледаваньня). Т.: (0232) 48-38-91. Аўген

### ПРАДАМ

**Прадам** рубэройд, цэмэнт, фарбу, тынкоўку. Т.: (017) 224-75-21, 8-029-756-45-78

### ПРАЦА

**Масажыст** прапануе паслугі. Нізкі кошт за высокую якасьць. Т.: 8-029-756-81-99

Сябры РГА «Беларускі Хельсынскі камітэт» глыбока смуткуюць з прычыны сьмерці Васіля Быкава, народнага пісьменьніка Беларусі, сузаснавальніка і першага старшыні Назіральнага сойму БХК, таго, хто казаў праўду пра жыцьцё і гісторыю Беларусі, у кім адбівалася яе душа.

Мы шчыра спачуваем жонцы Ірыне і ўсім блізкім Васіля Быкава.

!
Толькі да жніўня ЗЬНІЖКА
на відэакасэты **«Пан Тадэвуш»**
на 1000 рублёў. А/с 150, 220107,
Менск. Пэйдж.: 211-85-85, аб.25402.
E-mail: belvidea@hotmail.com

## КРЫЖАВАНКА



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 5.** Галоўны байкапісец БССР. **6.** «Нашы лясы — гэта наша скарбонка і ...» (Мікола Гусоўскі). **9.** Мясьціна на Аршаншчыне, дзе было лецішча Янкі Купалы. **10.** Тонкая адбіўная ці крышаная катлета. **11.** Спатканьне на францускі кшталт. **12.** Да яе ўвесь час імкнуўся старшыня ВС Станіслаў Шушкевіч. **14.** Паўночнаафрыканская дзяржава, на тэрыторыі якой быў некалі Картаген. **16.** Зь іх сплялі вянок Ісусу Хрысту. **18.** Маладзік, поўня, ветах — гэта ... Месяца. **19.** Той, хто робіць цэбры і бочкі, а таксама начальніца холдынгу «Літаратура і мастацтва». **23.** Горад на поўначы Гішпаніі, недалёка ад порту Хіхон; сталіца колішняга каралеўства Астурыя. **25.** Яе прымаюць праваслаўныя манахі. **26.** Тое, чым мяце завіруха. **27.** Зьяўленьне ў арганізмаў прымет, уласьцівых далёкім продкам. **29.** Народны паэт Беларусі, аўтар тэксту песьні «Вы шуміце, бярозы». **30.** Найвялікшы правадыр гунаў, які памёр на шлюбным ложку. **31.** Рэптылія, што ў выпадку небясьпекі ахвяруе сваім хвастом. **32.** Адзін з дэлегацыі.

**ПА ВЭРТЫКАЛІ: 1.** «Цыганскі барон» Ё.Штраўса, «Сыльва» І.Кальмана, «Вясёлая ўдава» Ф.Легара (жанр). **2.** Гэтак адказваюць беларусьфільмаўскія фрыцы на загады начальства. **3.** Возера, мястэчка і санаторый на Мядзельшчыне. **4.** Соль у камяках, якую даюць лізаць худобе. **5.** Амэрыканскі псыхоляг, які прыдумаў амэрыканскую ўсьмешку. **7.** Канчатковая мэта будыста, а таксама рок-гурт, ад якога пачалася мода на грандж. **8.** Вырабленая авечая скура. **13.** Пераможца Галіяфа ў біблейскім паданьні. **14.** Палясоўшчык, які быў на Парнасе. **15.** Непагода з дажджом і мокрым сьнегам, а таксама раньні альбом гурту «Мясцовы час». **17.** Тое, у чым вінавацілі Гуса, Каперніка, Галілея. **20.** Краіна, якая дала сьвету Шварцэнэгера і Кафку. **21.** Так па-навуковаму называецца сумесь бульдога з насарогам. **22.** Шлюбны звычай у некаторых народаў, паводле якога ўдава была абавязана ці мела права выйсьці замуж за брата свайго памерлага мужа. **24.** Галоўны порт Рэспублікі Кот-д'Івуар. **26.** Хрэстаматыйная аповесьць Зьмітрака Бядулі. **28.** Нямецкая валюта-нябожчыца. **29.** Прэзыдэнт Чэхаславакіі, а пасьля Чэхіі.

**Склаў Сяргей Петрыкевіч**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Базылёва В. Крылы ў шафе:** Вершы / — Менск: УП «Тэхнапрынт», 2002. — 144 с.: іл.

Аўтарка гэтага зборніка вядомая таксама як мастачка ды бард. Знайсьці кнігу можна на выставе ТБМ.

**Верамейчык С. Міхал Клеафас Агінскі, 1765—1833 гг.: Продкі, жыцьцё ў Залесьсі, нашчадкі (спроба храналёгіі).** — Менск: ВТАА «Кавалер Паблішэрс», 2003. — 128 с.: іл. 1500 ас.




Аўтар кнігі — мастак, рэстаўратар, краязнаўца — літаральна па днях рэканструюе жыцьцёвы шлях славутага дыплямата, паўстанца 1794 г., кампазытара М.К.Агінскага. Займальнасьць ды жывасьць матэрыялу надаюць шырока цытаваныя ў выданьні мэмуары Агінскага, фрагмэнты зь ягонага ліставаньня з рознымі асобамі (у тым ліку з Касьцюшкам), разнастайныя гістарычныя дакумэнты, а таксама шматлікія ілюстрацыі — партрэты, выявы сядзібаў і г.д. Асаблівая ўвага зьвернутая ў кнізе на гісторыю й сучасны стан «Паўночных Афінаў» — маёнтку Залесьсе.

**Вішнеўскі А., Юхо Я. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакумэнтах і матэрыялах: Са старажытных часоў да нашых дзён**. — 2-е выд., дап. — Менск: Акадэмія МУС РБ, 2003. — 320 с.

У зборніку пададзеныя (цалкам ці ў скарочаным выглядзе) дакумэнтальныя й гістарычныя крыніцы, што тычацца беларускай дзяржаўнасьці: ад вытрымак з Герадота і дамовы з Рыгаю да сёньняшняй Канстытуцыі. Не абыдзеныя ўвагаю і Ўстаўныя граматы БНР. Прыдбаць кнігу можна ў «Цэнтральнай кнігарні».

**Вукар:** Бюлетэнь настаўніцкага згуртаваньня «Вулей». — 2003. — №1.

Выданьне зьмяшчае «Дэклярацыю настаўніцкага згуртаваньня «Вулей», артыкулы, прысьвечаныя выгляду настаўніка ды вучняў (рубрыка «Меркаваньні»), сувязям паміж хрысьціянствам і школай. Ёсьць таксама гутарка з стваральнікам Гудзевіцкага краязнаўчага музэю Алесем Белакозам — настаўнікам «узорна-паказальнай» беларускай школы пры саветах. Наклад 150 ас.

**Гурэвіч Ф. Летапісны Новгородок (Старажытны Наваградак).** — Санкт-Пецярбург—Наваградак, 2003. — 324 с.: іл. 500 ас.

Аўтарка манаграфіі прысьвяціла археалягічнаму вывучэньню Наваградку — дзядзінца ды вакольнага гораду — амаль 30 гадоў. Гэтае дасьледаваньне зьяўляецца працягам кнігі «Старажытны Наваградак», выдадзенай у 1981 г. у Ленінградзе. Цана ў «Акадэмкнізе» — 19200 руб.

**Свой Лад:** Інфарм.-аналіт. бюлетэнь Гарадзенскага аддзяленьня ГА «Фонд імя Лява Сапегі». — 2003. — №6. 299 ас.

«Чаму ў нас ня любяць Амэрыкі?», «У Багдадзе ўсё спакойна», «Звычайны антынацыяналізм» — гэткія матэрыялы асьвятляюць грамадзка-палітычныя праблемы Беларусі й сьвету. У рубрыцы «Наш горад» друкуецца артыкул Юрася Пацюпы «Яйка, зьнесенае ў кабінэце?»: на аснове літаратурных, лексыкаграфічных, гістарычных крыніцаў ды сьведчаньняў старых гарадзенцаў аўтар спрабуе вызначыць, які варыянт назвы — «Гародня» ці «Горадня(а)» — слушны.

**Тацяна Вабішчэвіч**

## КОНКУРС «НН»

Лясная: **Ч**аму **А**пранае **Ж**абрак **З**аяц **Б**агатае **С**рэбнае **Ф**утра?

Клюбная: **Ч**аравік **А**бцасам **Ж**ух — **З**ух! **Б**алявацьь **С**абраліся **Ф**ранты.

Армейская: **Ч**хнеш «**А**пчхі!» — **Ж**адаюць **З**дароўя: **Б**удзеш, **С**алдат, **Ф**эльдмаршалам!

Вартаўнічая: **Ч**уеш **А**поўначы **Ж**уліка, **З**агадай **Б**арбосу: «**С**абака, **Ф**ас!»

Клапатлівая: **Ч**ас **А**раць. **Ж**аўрук **З**ьвініць. **Б**ульбу **С**аджае **Ф**эрмэр.

Шлюбная: **Ч**акае **А**гата **Ж**аніха **З**аручонага — **Б**удуць **С**ваты **Ф**айныя!

**Кастусь Севярынец, Віцебск**

**Ч**эскі **П**ан **Ж**адае **З**ноў **Б**ачыць **С**орак **Ф**азаноў.

На мой погляд, слова «пан» у дадзеным выпадку можа быць выкарыстанае і для варыянту «памаранчавы» (дзеля першае літары), і для варыянту «аранжавы», бо літара «а» ў гэтым слове пад націскам.

**Ne-st**

**Ч**атыры **П**ані **Ж**ылі ў **З**бане, **Б**ылі ў **С**тане **Ф**айным.

**Ч**атыры **П**аны/**А**рлы **Ж**адалі **З**найсьці **Б**язьмежныя **С**карбы **Ф**э.

**Сяржук Жвір, Віцебск**

З улікам таго, што наша Сонца належыць да катэгорыі жоўтых зорак, прыдумалася вось якая спэктральная прымаўка: **Ч**акаю **А**д **Ж**оўтай **З**оркі **Б**ольш **С**акавітых **Ф**арбаў.

**Ляля Кабачэўская, yahoo.com**

Спадарыня Юзэфа Найдзюк з Пасадэны (ЗША, Каліфорнія) падпісала на «Нашу Ніву» двох чалавек. Вялікі ёй дзякуй.

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Эдуарду Т. з Смалявіч.** У такім разе дашлеце каардынаты, на якія Вам маглі б пісаць апанэнты.

**Сяргею Б. з Гомелю.** Калі занадта мудрагеліста — нясьмешна. А з Вашых фрэналягічных дасьледаваньняў склалася б файная кніжка.

**Інэсе Н. з Барысава.** Дзякуй за добрыя словы і за тое, што падтрымалі падпіскай. Дзеля такіх, як Вы, мы і працуем.

**Аляксандру У. з Гомелю.** Ваш футбольны камэнтар добра б прыдаўся ў «НН» №22. Цяпер друкаваць яго пазнавата.

**Сяргею П. зь Менску.** Адкладзіце часова думкі пра артыкулы ды сур'ёзна засядзьце за падрыхтоўку да ўступных іспытаў. Чым лепшую атрымаеце адукацыю, тым больш карыснага зможаце зрабіць для Беларусі.

**Пятру Ф. з Чамярысаў.** Праграму перадрукоўваем на тры дні, бо гэтак ёю зручней карыстацца.

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ______________________________

______________________________

**Імя і прозьвішча** ______________________________

**Адрас, тэлефон** ______________________________

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Сяргей Ёрш |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а.

Наклад 3509.

Нумар падпісаны ў друк 25.06.2003.

Замова № 3286.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а